Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 49 (2638) Год LI Беласток, 3 снежня 2006 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Выбары: Бельск — Гайнаўка

Войт Орлі Пётр Сэльвесюк

Войт Чыжоў Юрый Васілюк

Бельская кааліцыя (БК) і Беларуска-народны выбарчы камітэт (БНВК) без сумнення могуць гаварыць аб перамозе на самаўрадавых выбарах 12 лістапада. У апошнюю нядзелю падтрымліваны БК кандыдат на бурмістра Бельска Пётр Божка перайшоў у другі тур выбараў, але прайграў (2 991) з Яўгенам Беразаўцом (3 958). У Орлі войтам стаў Пётр Сэльвесюк прапанаваны Бельскай кааліцыяй.

На 21 самаўрадніка ў Гарадской радзе Бельска-Падляшскага ад БК свой мандат будуць выконваць аж сем асоб. Найбольшую падтрымку мелі Раіса Іванюк (228 галасоў) і Ала Сасна-Паўлючук ды Марк Верамяюк (па 186 галасоў). Бельскую кааліцыю ў радзе будуць прадстаўляць яшчэ Дарафей Фіёнік, Аляксандр Божка, Андрэй Сцепанюк і Андрэй Рошчанка. У бельскай Гміннай радзе з 15 дэпутатаў засядуць падтрымліваныя БК Анатоль Вышкоўскі, Станіслаў Якімюк, Юрый Тамчук ды Кацярына Екацерынчук, Валянцін Галушэўскі, Павел Лазавік, Марыя Бесяда, Юрый Хількевіч і Марк Плуг.

У Радзе Бельскага павета ад Бельскай кааліцыі засядуць па чарзе Пётр Божка, дырэктар Пачатковай школы з беларускай мовай Васіль Ляшчынскі, Міраслаў Бала і Юрый Ігнацюк. У Радзе гміны БК мае аж дзевяць з пятнаццаці мандатаў.

Выбарчыя вынікі Бельскай кааліцыі так абмяркоўвае ўпаўнаважаны гэтага камітэта Андрэй Сцепанюк:

— Выбары ў бельскую Гарадскую раду, можам сказаць, прайшлі паспяхова. Атрымалі мы найбольшы вынік — на нас прагаласавала 2 700 выбаршчыкаў і маем тут найбольш мандатаў. Аказваецца, у Бельску наша кааліцыя за больш чым дзесяцігадовы перыяд сваёй дзейнасці заваявала пастаянны электарат. У бельскай Радзе гміны трымаем таксама большасць. Страцілі мы адзін мандат у Радзе павета. Можам цешыцца знакамітай перамогай у Орлі.

У сваю чаргу ў гайнаўскай Гарадской радзе на агульны лік 21 дэпутата зясядзе шэсць прадстаўнікоў ад БНВК: Яўген Сачко, Віктар Дзік, Пётр Маркевіч, Валянціна Асташэўская, Вера Масайла і Рыгор Сурэль. Безагаворачным лідэрам стаў дырэктар Комплексу школ з беларускай мовай Яўген Сачко — аж 603 галасы. За ім апынуліся: Віктар Дзік (145 галасоў) і Пётр Маркевіч (143 галасы). У Радзе Гайнаўскай гміны з падтрымліваных БНВК кандыдатур раднымі сталі Андрэй Секан (148 галасоў) ды Валянціна Бірылка (77) і Уладзімір Галёнка (111). Гледзячы на вынікі ў Раду павета ў Гайнаўцы можна меркаваць, што на гэтым узроўні мясцовай самаўрадавай улады няшмат зменіцца, паколькі ў яе кіраўніцтва ўвайшлі м.інш. Ежы Сірак і былы гайнаўскі староста Уладзімір Пятрочук ды асобы, якія іх падтрымліваюць. БНВК увёў сюды чатырох сваіх кандыдатаў на агульны лік 17 радных. З'яўляюцца імі Міраслаў Кульбацкі, Ірэна Негярэвіч, Міраслаў Пяткевіч і Міраслаў Раманюк. Найбольш — 713 — выбаршчыкаў аддало свой голас на Ірэну Негярэвіч.

У Дубічах-Царкоўных мандат ад БНВК выконваць будзе пецярых радных: Ян Жак, Уладзіслаў Беразняк, Мікалай Галёнка, Ніна Аксянцюк і Аляксей Троц. Найбольш галасоў здабыла Ніна Аксянцюк (60).

Вынікі Беларуска-народнага ВК так каментуе ягоны ўпаўнаважаны Міхал Андрасюк:

— На выбарах у Гарадскую раду ў Гайнаўцы мы атрымалі добры вынік, хоць, вядома, мог бы ён быць лепшы. Не задавальняе нас вынік на выбарах у Раду павета. У мінулы раз мелі мы пяць мандатаў; хацелі мы здабыць больш, а прынамсі столькі ж. Можам ганарыцца выбарамі ў Гмінную раду ў Чыжах. У Дубічах, хоць прайгралі мы выбары на войта, можам радавацца выбарам пяці чалавек у тамашнюю Раду гміны. Усюды там, дзе мы вылучылі кандыдатаў, хтосьці ўвайшоў.

Аб вялікім поспеху на гэтых выбарах можа гаварыць Юрый Васілюк, новы-стары войт Чыжоўскай гміны (БНВК). Падтрымала яго больш за 86 працэнтаў выбаршчыкаў. Войт Юрый Васілюк ужо цяпер пералічвае што неўзабаве хоча зрабіць: завяршыць пабудову чарговага этапу каналізацыі, перабудову гмінных і павятовых дарог, вяртанне да дзейнасці ўсіх святліц і клубаў (агулам дзевяці; найбліжэйшы комплексны рамонт чакае святліцу м.інш. у Моры), добраўпарадкаванне пляцоўкі ля чыжоўскай школы.

І што цікавае, уся Гмінная рада ў Чыжах, усе 15 дэпутатаў, гэта кандадаты ад БНВК. Найбольш галасоў здабылі Васіль Гаўрылюк (152), Андрэй Ціханюк (150), Яўген Іванюк (146) і Вера Ядночка (100).

Другі тур выбараў на войта адбыўся ў Орлі. Сапернічалі Уладзімір Сахарчук (706) і падтрымліваны Бельскай кааліцыяй Пётр Сэльвесюк (1 027 галасоў — 59,26%). Бельская кааліцыя ў Раду гміны з 15 асоб увяла дзевяцёх радных. Найбольш выбаршчыкаў аддало свой голас на Ірэну Рэнгайла (105) ды на Лешка Конюха (103). У Чаромсе змагаліся Юры Шыкула (883) і выконваючы дагэтуль абавязкі войта Міхал Врублеўскі (1 052). А ў Белавежы Альберт Вальдэмар Літвіновіч (739) перамог неафіцыйна падтрымліванага ВНВК Міхала Корха (378).

Агулам на тэрыторыі Бельскага і Гайнаўскага паветаў выбары прайшлі адносна спакойна. Можа, апрача Чаромхі, дзе выдалі больш за 100 карт для галасавання без пячаткі камісіі, а гэта значыць, што галасы аддадзеныя на іх палічаны былі няважнымі. Гэта можа стаць прычынай анулявання выбараў, аб чым вырашыць суд.

Раіна СТЭФАНЧУК

Ваўкі і вегетарыянства ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

На мінулым тыдні ў палітычным жыцці Беларусі, зважаючы на міжнародны кантэкст, адбыліся дзве знакавыя падзеі, якія сталіся ў значнай ступені сенсацыйнымі. Па-першае, Еўрасаюз прапанаваў новую стратэгію дачыненняў з дзяржавай Беларусь. Па-другое, Аляксандр Лукашэнка зладзіў прэсавую канферэнцыю для ўкраінскіх журналістаў, на якой прагучала сенсацыйная заява. Абедзве рэчы адбыліся неўзабаве пасля сустрэчы Лукашэнкі з прэзідэнтам Расіі Пуціным, на якой, на думку бальшыні, „дружественные" бакі не здолелі дамовіцца наконт прынцыповых рэчаў...

Царква будуецца ☞ 4

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Праваслаўны прыход у сённяшняй Дуброве-Беластоцкай пачаў нараджацца ў пачатку 1980-х гадоў. І з таго часу датуецца будова дуброўскай царквы. Адным з вядучых прыхаджан, заангажаваных у царкоўнае будаўніцтва, з'яўляецца Мікалай Дземях...

Чый музей? ☞ 8

Аляксей МАРОЗ

На агульны сход Аб'яднання „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы", які праходзіў 25 лістапада ў музейным будынку, не прыехалі яго члены з Беластока і Варшавы. Хутчэй за ўсё ў выпадку многіх асоб спрычынілася да гэтага нявырашаная справа ўласнасці музейных будынкаў, аб якой многа гаварылася ў час пасяджэння. Зараз юрыдычным уласнікам аб'екта з'яўляецца Галоўнае праўленне БГКТ, але ўдзельнікі з'езда пераконвалі, што амаль усе дакументы, пацвярджаючыя правядзенне будовы музея, выстаўлены на „Грамадскі камітэт пабудовы музея, помніка беларускай культуры і рэвалюцыйнага руху", які пасля пераўтварыўся ў вышэйзгаданае аб'яднанне...

Запрашэнне

Драматычны тэатр імя А. Вянгеркі запрашае ў днях 2-3 снежня 2006 г. на спектакль **„Рок-канцэрт"** у выкананні акцёраў **Драматычнага тэатра з Гродна.** Рэжысёрам з'яўляецца Генадзь Мушперт, а спектакль — сцэнічная фантазія — паўстаў на аснове драмы вядомага аўтара Рыгора Горына. Пачатак у 19.00.

Асеннія настроі

Вось месца пад цьмяным сонцам, вось няўлоўнае цяпер, якое явіца нам як расхістанае тонкае лязо паміж дзвюма прорвамі, паміж тым, што ўжо стала і быць можа не адменіцца, а гэтым, што надыходзіць няўхільнае, каб пасля таго, як перакрочыць мяжу, паглынула яго пагрозлівае небыццё.

Вось прытулішча жменькі паэтаў. Паэт-постмадэрніст абвяшчае зыход мастацтва, літаратуры, прынамсі ў гэтым выглядзе, да якога мы прывыклі і да якога нас прывучылі. На яго думку, пачаткам усенькага мастацтва было хвалапенне бажкам і багам, наступным чынам апяванне герояў і ўладароў. Мастацтва, значыць, мела службовы характар, падпарадкавана было касцельнай ці свецкай уладзе, аднак усё ж скрывала тую залежнасць, клаўшы націск на аўтаномію каштоўнасцей, ці то гуманістычных, ці эстэтычных, такіх як праўда, дабрыня і краса. Новае мастацтва, — гарачыўся паэт, — павінна вызваліцца ад любых залежнасцей, што і спрабуе рабіць, праяўляючыся як правакацыя, бунт, радасць знішчэння; новыя мастакі разгульваюцца шляхам непасрэднага дзеяння, у пачыне, у валоданні целам, у паказе сваёй цялеснай індывідуальнасці. Традыцыйны, класічны твор мастацтва ці літаратуры ўспрымалі атрымальнікі як выраб, як тавар на рынку, значыць, такі выраб павінен знікнуць, адысці ў забыццё.

Адстаўны прафесар універсітэта нясмела запярэчыў. Новая рэальнасць, на яго думку, не з'яўляецца, не мусіць быць такая няшчадная і нігілістычная. Змена стаўлення да мастацтва, чаму ж не, становіцца на нашых вачах разам з паскарэннем усёабдымнай глабалізацыі, ды істота мастацтва ў чымсьці іншым. Мастацкая творчасць мела найчасцей крыніцу або ў лішку энергіі ствараючага індывіда, або ў яго хваробе. Сёння здаецца, што энергічныя і актыўныя асобы рэалізуюцца або ў палітычных акцыях, або ў прадпрымальніцтве, у бізнесе. Тэрыторыю чыстай культуры засяляюць тыпы хворыя, недапасаваныя да рэальнасці, шалёныя, фантасты, выкінутыя на абочыну быцця, нацыянальныя ці грамадскія мяншыні, феміністкі і геі. Таму іхні бунт набывае выгляд безадказнай анархіі.

— Я супраць хваробы, — прахрыпеў рэпарцёр мясцовага тэлебачання. — Вось ідуць часы, калі лічыцца будзе толькі маральная чысціня, адно цнатлівасць. Толькі маральны мастак варты падтрымкі. Сістэму немаральных асобеняў трэба бязлітасна знішчаць, выкараніць, выцерабіць да каліва, а я дык ужо добра ведаю, як за гэта ўзяцца.

У мастакоўскай кавярні запанавала ціш. Адно чутна было, як далікатна на арфе пабрынкваюць музы, а, можа, толькі бурчыць у жыватах бядотных артыстаў.

А мне, вось, падумалася, што Гасподзь Бог уступіў нам, людзінам, крышынку свае свабоды, дапушчаючы гэтым самым магчымасць недахопу, недахопу ідэалу, значыць, таксама і прасторы бяссэнсу ці хаосу. Ідэал — адно боская патэнцыя, а той чалавек, наш бліжні — які ж слабы ён, які недасканалы. Ягонае бытаванне распасцерта паміж адабрэннем, згодай на тое, што ёсць, значыць таксама — на пакорлівае мераннe з лёсам, на прыхільнае трактаванне сябе-ў-свеце, а актам творчасці, змены, пераўтварання быту, значыць — нязгоды на ўсё тое. А беднае мастацтва, насуперак запэўніванням і творцаў, і тэарэтыкаў, і атрымальнікаў — у сапраўднасці нікога не выхавала, не ўчыніла больш уражлівым, высакародным.

Мабыць, аднак, да яго ідуць высакародныя людзі. Бо не прапалі яны, не вымерлі. Можа, гэтак яно і ёсць.

Ежы ПЛЮТОВІЧ

Ваўкі і вегетарыянства

На мінулым тыдні ў палітычным жыцці Беларусі, зважаючы на міжнародны кантэкст, адбыліся дзве знакавыя падзеі, якія сталіся ў значнай ступені сенсацыйнымі. Па-першае, Еўрасаюз прапанаваў новую стратэгію дачыненняў з дзяржавай Беларусь. Па-другое, Аляксандр Лукашэнка зладзіў прэсавую канферэнцыю для ўкраінскіх журналістаў, на якой прагучала сенсацыйная заява. Абедзве рэчы адбыліся неўзабаве пасля сустрэчы Лукашэнкі з прэзідэнтам Расіі Пуціным, на якой, на думку бальшыні, „дружественные" бакі не здолелі дамовіцца наконт прынцыповых рэчаў.

Стары Свет пасля антыканстытуцыйнага рэферэндуму 1996 года замарозіў усялякія праекты па супрацоўніцтве і партнёрстве паміж Еўрасаюзам і Беларуссю. З таго часу дачыненні былі больш чым прахалоднымі. Тут можна згадваць і ўзаемныя высылкі дыпламатаў і шматлікія заявы з абодвух бакоў і непрыхаваную варожасць. Стасункі Беларусі з Еўропай няўхільна пагаршаліся дзесяць гадоў. Працэс зайшоў досыць глыбока. І вось новая палітычная стратэгія Еўрасаюза. Беларускай дзяржаве прапаноўваецца канкрэтная эканамічная дапамога — адкрытыя рынкі, грашовыя гранты для беларускіх прадпрыемстваў і фірмаў, спрашчэнне візавага рэжыму, іншыя прэферэнцыі. З іншага боку ад уладнага рэжыму Беларусі патрабуецца спыніць пераслед апазіцыі, вызваліць палітычных вязняў, правесці сапраўднае следства па гучных справах аб знікненні палітыкаў і журналістаў, забяспечыць адкрытыя і незалежныя судовыя працэсы, свабодныя выбары, правы нацыянальных меншасцей. Усяго ў пераліку 12 пунктаў-умоў. Па меркаванні многіх такая „гандлёвая" стратэгія запозлілася гадоў на пяць. Іншыя даводзяць, што паколькі паміж Крамлём і афіцыйным Мінскам толькі цяпер узніклі пэўныя сур'ёзныя супярэчнасці, самы час распасцерці руку дапамогі дзяржаве Беларусь.

Яшчэ нікому не ўдавалася зрабіць ваўкоў вегетарыянцамі. Нават калі пасадзіць іх у асобную клетку, асноўны прыродны інстынкт бярэ сваё. Я глыбока перакананы, што бальшыня правячай гаспадарчай наменклатуры Беларусі ўхапілася б за гэтыя прапановы Еўрасаюза. Ужо многім абрыдла абсурдная сітуацыя, калі гаспадарка становіца хвастом ідэалогіі. Але тыя некалькі чалавек, што ажыццяўляюць рэальнае вышэйшае кіраванне ў дзяржаве, ніколі ўжо не зменяцца і не саступяць нават у малым. Генеральны кірунак, які абраны, яны будуць упарта ўкараняць да апошняга моманту сваёй улады. Таму з пачаткам новай выбарчай кампаніі ў мясцовыя „дэкаратыўныя" саветы рэпрэсіі супраць апазіцыйных актывістаў разгараюцца з новай сілай. Часам здаецца, што паляванне на іншадумцаў — галоўная справа ўсіх структур — камітэта дзяржаўнай бяспекі, міліцыі, падатковай інспекцыі, ваенкаматаў і гарвыканкамаў, дырэктараў школ і заводаў. Прычым растаптаны апошнія межы знешняй прыстойнасці — нязгодным з дзяржаўнай антыбеларускай ідэалогіяй пачынаюць падкідваць наркотыкі і фальшывыя грашовыя купюры, ломяць замкі і залазяць у машыны, урываюцца без усялякіх падстаў у прыватныя дамы і кватэры, сцягваюць з цягнікоў і не пускаюць за мяжу. Многім з выканаўцаў агідных і брудных спраў ужо перастае быць сорамна. Як казалі старажытныя — *homo homini lupus est* (чалавек чалавеку воўк). Тое, што на „палітычнае вегетарыянства" ўлада не пойдзе, пацвердзіла і заява Міністэрства замежных спраў Беларусі, якое наўпрост назвала прапановы Еўрасаюза фальшывай прапагандай.

Ну а на прэс-канферэнцыі для людзей з Украіны, якіх назвалі журналістамі, Аляксандр Рыгоравіч з уласцівай яму аднаму шчырасцю прызнаў факт фальсіфікацыі вынікаў прэзідэнцкіх выбараў. Маўляў, за Лукашэнку прагаласавала ажно 93,5 адсотка выбаршчыкаў, але мы зрабілі 86, каб былі еўрапейскія паказчыкі. А гэтыя крывадушныя еўрапейцы ўсё роўна крычаць пра фальшаванне падліку галасоў! Праз дзень Цэнтральная выбарчая камісія ў адмысловай заяве паспяшыла адхрысціцца ад такога прызнання свайго начальніка. Ды было позна, анекдот ужо застаўся ў гісторыі...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Вачыма еўрапейца

Еўрапейскі пернік

Я ўжо думаў, што Еўрасаюз, значыць, Еўрапарламент і Еўрапейская камісія забыліся пра Беларусь, кінулі аказваць націскі накіраваныя на дэмакратычныя перамены ў гэтай краіне. Ну і памыліўся. Тыдзень таму Еўрапейская камісія перадала беларускім уладам дакумент у тры старонкі (паруску і па-беларуску) — свайго роду палітычны запавет. Намаўляе ў ім да дэмакратычных перамен, узамен абяцаючы дапамогу з рознага роду еўрасаюзных праграм.

Беніта Ферэра-Вальднер, камісар па знешніх адносінах і палітыцы добрасуседства Еўрасаюза пераконвала:

— Гэты дакумент — такі еўрапейскі пернік. Паглядзіце, што ЕС можа вам запрапанаваць, калі Беларусь зменіцца. Беларусы, пабачце, што вы траціце!

Як падкрэслівала, адрасатам еўрасаюзных прапаноў з'яўляюцца сярэднія беларусы, а гэта таксама азначае, што ЕС не адступіць ад санкцый накіраваных у адрас рэжыму Аляксандра Лукашэнкі, такіх як хаця б забарона ўезду на тэрыторыю краін ЕС дваццаці пяці чыноўнікам, журналістам ці суддзям, маючых дачыненне да парушэння грамадзянскіх правоў.

— Людзі маюць права на тое, каб ведаць што страцяць, не ўдзельнічаючы, так як іншыя суседскія краіны ЕС, Украіна ці Марока, у Еўрапейскай палітыцы добрасуседства. На супрацоўніцтва не дазваляе рэжым прэзідэнта Лукашэнкі. Мы верым, што калі грамадства даспела да выбару, дык выбярэ дэмакратыю. Так, як гэта зрабілі ўкраінцы.

У еўрасаюзнай прапанове справа ў першую чаргу ў павелічэнні аб'ёмаў эканамічнага і гандлёвага супрацоўніцтва, падтрымцы беларускіх фірм і прадпрыемстваў, дапамозе ў адміністрацыйных рэформах і палёгках у падарожжах у краіны ЕС, а таксама ў супрацоўніцтве ў галіне адукацыі шляхам, напрыклад, стыпендый беларускім студэнтам. Прытым ЕК заклікала м.інш. вызваліць палітвязняў, гарантаваць свабоду слова і свабодныя выбары. У гэтым апошнім выпадку праверкай добрай волі беларускага боку будуць у найбліжэйшы час студзеньскія самаўрадавыя выбары.

Лідэры беларускай апазіцыі, хоць з задавальненнем прынялі еўрасаюзны дакумент, аднак некаторыя з іх не скрываюць скептыцызму. Сяргей Калякін, кіраўнік камуністычнай партыі заявіў у размове з Радыё Сабода:

— Я мяркую, што ЕС выкарыстае сітуацыю, якая ўзнікла ў эканамічных стасунках паміж Беларуссю і Расіяй. Нават прымаючы пад увагу гэты фактар, я сумняваюся, каб беларускія ўлады прынялі гэтую прапанову.

І, мабыць, так і будзе, што афіцыйны Мінск застанецца верны Крамлю ў яго гульні з ЕС, асабліва ў кантэксце заблакіравання Польшчай новага еўрасаюзна-расійскага кантракта. Варта тут аднак прывесці словы Аляксандра Мілінкевіча, лідэра беларускіх дэмакратычных сіл:

— Для разважных улад гэта вялікі шанц на развіццё гаспадаркі, вырашэнне праблем у Беларусі. ЕС павінен весці сябе вельмі паслядоўна і не дазволіць, каб беларускія ўлады яго зводзілі. Беларускія ўлады павінны зразумець, што дэмакратыя гэта не адно патрабаванне нейкай часткі грамадства, а ўмова ўваходу нашай краіны ў цывілізаваны свет.

Ці беларускі рэжым гэта зразумее? Пакуль што ЕС — як сказала камісар Ферэра-Вальднер — запрапанаваў адно пернік. Адначасова пакідаючы бізун, значыць, увядзенне заяўленых раней эканамічных санкцый. На гэты ход не далі згоды Польшча, Літва і Латвія, мяркуючы, што ён ударыць па беларускім грамадстве.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

ГОНАР ЛЯХОЎ І ЎСІХ БЕЛАРУСАЎ

Па дарозе паміж Нарвай і Бельскам-Падляшскім ляжыць невялікая вёска Ляхі. Вядзе да яе з найбліжэйшае мясцовасці пясчаная дарога. Гаспадарак тут будзе з трыццаць. Якраз тут нарадзіўся і выгадаваўся падпалкоўнік Расціслаў Сцепанюк, першы абучаны ў ЗША пілот найсучасных баявых самалётаў F-16, камандзір 3 эскадры тактычнай авіяцыі, якая будзе лятаць на гэтых „ястрабах”.

У Кленіках і саміх Ляхах не трэба ведаць адрас. Кожны ведае, дзе жыў Росцік. Уся ваколіца 9 лістапада аглядала ўрачыстае прывітанне першых баявых самалётаў *Lockhed Martin F-16 block 52+*. Глядзелі, як у амерыканскай машыне з экіпажам у дзве асобы на лётнішча ў познаньскіх Кшасінах прыляцеў іх зямляк, як даваў начальніку Польскіх Узброеных Сіл, прэзідэнту РП Леху Качынскаму прысягу і ўручаў яму польскі сцяг. Як першыя такія баявыя самалёты былі пасвечаны, а жонка прэзідэнта ахрысціла польскі F-16 імем „Ястраб”. Ад таго часу бацькам падпалкоўніка з Ляхоў — Надзеі і Васілю Сцепанюкам не даюць спакою. Бацюшка з Кленік Аляксандр Высоцкі яшчэ ў той год, калі тэлебачанне паказвала падпалкоўніка Расціслава ў Амерыцы, пытаўся ў яго бацькоў пасля багаслужбы:

— Вы бачылі, бачылі свайго сыночка?

Тэлефон ужо ад чэрвеня гэта для бацькоў і сяброў адзіны кантакт з Росцікам. Не можа вырвацца з тае Познані. Чакалі ў першы уік-экд ад таго чацвярга. Спадарыня Надзея рашыла пазваніць у Познань.

— Тут у нас журналіст з „Нівы”. Ну і то, што напішуць? Напішуць, як мы табой ганарымся, што ёсць такі зух з Ляхоў...

На канец падпалкоўнік Сцепанюк пагаджаецца хвіліну паразмаўляць:

— Гэта цяжкая праца. У ацэнцы начальнікаў я справіўся. Цяпер у мяне мноства работы, я загружаны абавязкамі. Мушу перадаць усе свае веды з Амерыкі. Пасля, мабыць, будзе лягчэй, калі будуць з'язджацца з месяца ў месяц чарговыя дванаццаць абучаных. Пакуль што тут усе карыстаюцца адно маім вопытам.

І дадае па-афіцэрску:

— Стараюся ўсе абавязкі выконваць сумленна. З-за таго пэўна асабліва цяпер не хапае часу, каб наведаць дом.

Сціплы і такі скрытны

Перад домам у Ляхах расце яблынька. Спадар Васіль успамінае, як ягоны Росцік штодзень на ёй падцягваўся і бегаў па ваколіцы па больш за дзесяць кіламетраў. Дома ў нядзельны паслаабедзенны час малодшая ад Росціка сястра Вера. На штодзень працуе яна ў адным з беластоцкіх банкаў. Другой, Алы, маладзейшай на два гады, якраз няма. Жыве яна ў Бельску-Падляшскім, працуе ў інтэрнаце.

— Як ён прымроіў сабе ў маленстве, так і засталося, — расказвае маці Надзея. — Яшчэ, маленькім быўшы, склейваў мадэлі.

Мадэлей ужо няма.

— Панішчыў іх усе, бо мама з бабуляй усім іх паказвалі, а ён гэтага не любіў, бо засціплы быў і ёсць, — прыгадвае сястра Вера. — Сціплы такі Росцік, скрытны.

З жонкай Эдытай у ЗША

Спадарыня Надзея паказвае ложак, на якім спаў сённяшні падпалкоўнік, камандзір:

— Як я хацела яго пацалаваць, дык ён уціскаўся ў куточак ложачка, аж яго коўдрай утуляла.

— Склейваў тыя свае самалёты, прывязваў да нітак і вешаў па пакоях, — смяецца спадар Васіль.

— Падпісваўся на часопісы „Skrzydlata Polska” і „Żołnierz Wolności”. Там вычытаў аб той авіяцыйнай школе ў Дэмбліне, ды нам аб гэтым нічога не сказаў. А калі быў у тэлебачанні нейкі фільм пра войска, дык дома мела быць цішыня! А калі пускалі які фільм пра каханне, казаў: „Тфу, пайшла мацы!”, браў начную лямпачку ды ішоў на печ чытаць, вучыцца.

Праз хвіліну прыпамінаецца маці:

— Раніцай я ўстаю і бачу: а ў кухні сцяна белым папырсканая...

— Тады не было ў нас водаправода... — уключаецца спадар Васіль.

— ... А ён браў з кубка халодную ваду і так шараваў зубы, шараваў, бо вычытаў, што зубы ў авіятараў мусяць быць здаровыя!

Фота Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Бацькі Расціслава, Надзея і Васіль, ганарацца сваім сынам

Здольны і такі прымірэнчы

Надзея Сцепанюк паказвае фатаграфіі ўнучанят. Малодшы з сыноў Расціслава Сцепанюка — Філіпка — кончыў годзік. Нарадзіўся ў Амерыцы.

— Гэта будзе грамадзянін Амерыкі.

Старэйшы — дзесяцігадовы Данілка на адным здымку прымервае бацькавы боты-афіцэркі. На адваротным баку напісаў: „А цяпер іду на працу”. На сямейных здымках відаць, як Росцік з жонкай Эдытай стаяць у скафандрах ля F-16 на тэрыторыі абучальнай базы ў Таксон (Арызона). Спадарыня Эдыта — дачка маёра авіяцыі.

— Калі Росцік быў у шоле ў Дэмбліне, на месяц прыязджаў дахаты, а на другі ездзіў на абучэнні ў Тамашаў. І там пазнаёміўся з Эдыткай, — тлумачыць спадар Васіль.

Сам бацька падпалкоўніка Расціслава ў арміі быў няпоўныя два гады, у Сахачэве ды ў авіяцыі служыў. Вярнуўся ў 1966 г.

— Ну, што ж, не лятаў я. Быў вартаўніком.

У той самы год, калі вярнуўся з арміі, нарадзіўся Васілю Расціслаў. Год пасля — Вера, праз год — Ала.

— Стаяў я быў на варце, глядзеў на тыя самалёты і мроіў: а, можа, мой сын будзе пілотам?

З сынам

Амерыканцы заінвеставалі ў Расціслава Сцепанюка 2 мільёны долараў. З Польшчы стартавалі да першага абучэння на F-16 тры маладыя пілоты. Усе знакамітыя. Найважнейшае было валоданне англійскай мовай. Хлопец з Ляхоў аказаўся быць найлепшым. Можа, таму, што пасля Вышэйшай афіцэрскай школы ў Дэмбліне кончыў прэстыжную Акадэмію нацыянальнай абароны і ў 1999 г. *Joint Services Command and Staff College* у Вялікабрытаніі.

— З тых трох кандыдатаў мелі паехаць двух. Ды толькі Росцік здаў экзамен па англійскай мове, — дадае сястра Вера.

— Росцік тры разы ездзіў у Амерыку, здаецца, на даследаванні, ці на штосьці там іншае. А на чацвёрты раз паехаў ужо на тры гады, — дадае бацька.

Спадарыня Надзея не скрывае:

— Людзі дзівуюцца, што ў нас такі сын. Усе. Быў здольны і такі прымірэнчы.

Маленькі і шчупленькі

Сённяшні падпалкоўнік кончыў Пачатковую школу ў Кленіках. Вучыўся м.інш. з Аляксандрам Максімюком, да нядаўна сакратаром „Нівы” ды вядомым тэлежурналістам Беластоцкага тэлебачання Міколам Ваўранюком. У паралельны клас хадзіў цяперашні епіскап Беластоцка-Гданськай епархіі Іакаў.

— Епіскап Іакаў гэта наш сваяк, дваюрадны, — кажа спадарыня Надзея.

Вера дадае:

— Росцік Сцепанюк, Алік Максімюк і Коля Ваўранюк усюды швэндаліся разам.

Маці Надзея:

— Я глядзела на Аліка і меркавала, які той мой Росцік маленькі, шчупленькі.

Алік Максімюк:

— Епіскап Іакаў быў у кленіцкай школе ад пачатку. Мы пасля рэарганізацыі школ дайшлі туды ў пятым класе. Усе мы сябравалі. Нават пасля школы засталіся сувязі. Класы рассыпаюцца, ды мы — Сцепанюк, Максімюк і Ваўранюк — не мусім сябе шукаць. Росцік ад пачатку, можа, ад чацвёртага класа ведаў, што хоча стаць авіятарам. Як усе дзеці, і мы мусілі напісаць работу: „Кім ты хочаш стаць у будучыні?” Росцік напісаў: „авіятарам”. І стаў ім. Застаўся верным гэтым дзіцяча-юнацкім ідэалам. Калі я штудзіраваў у Варшаве, пры кожнай нагодзе сцягваў яго на нашы імпрэзы. Сёння на такую кар'еру не дазволілі б. Адсеялі б яго пад абы-якой адмоўкай, а ў сапраўднасці па прычыне паходжання.

У Кленіках жыве ўвесь час выхавацелька падпалкоўніка Сцепанюка і ягоных калег, Генрыка Пракапюк:

— Гэта быў мілы і вельмі таленавіты хлопец. Быў у першай тройцы ці чацвёрцы выдатнікаў. І агульна ягоны клас, і паралельны, былі найлепшымі, якія я памятаю. Усё марыў аб самалётах і казаў, што будзе лятаць. На кожным малюнку Росціка быў самалёт. Здабываў мадэлі самалётаў, хоць было вельмі цяжка з гэтым у той час ды да таго ў вёсцы.

Епіскап Іакаў успамінае ў размове з „Нівай”:

— Я сустракаўся з Росцікам і пасля школы, бо мы і сваякі. З дзяцінства хапаў ён усё на ляту. Памятаю, як ездзіў на экзамены па вытрымцы ў Дэмблін, пра ўсё расказваў. Мы, калегі, слухалі з захапленнем пра яго дасягненні, бо хіба кожны з нас, маладых, марыў быць пілотам.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Выстаўка

19 лістапада г.г. у галерэі Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы (па вул. 3 Мая, 42) адкрылі пасляконкурсную выстаўку XIII Агляду непрафесійнага мастацтва Гайнаўскай зямлі. Агледзець тут можна найлепшыя 70 прац дваццаці аўтараў. Працы на экспазіцыі ў розных пластычных тэхніках: жывапіс, рысунак, тканіна, разьба.

Сёлета былі ўзнагароджаны працы Славаміра Рыбака, Міхала Яноўскага, Дыяны Янчук-Астапюк, Януша Кулешы і Марціна Коска — за жывапісныя карціны, Мікалая Ягадніцкага і Міхала Коца — за разьбу ды Тамары Кердалевіч — за бацік. Вылучэнне атрымалі мастакі-непрафесіяналы: Матэвуш Рыбак, Павел Мышак, Вольга Давідзюк, Катажына Пянькоўская-Кардовіч, Данута Станішэўская, Іаанна Мак, Рыгор Рамановіч, Кшыштаф Пабядынскі і Ангеліна Данілюк. Такім чынам арганізатар конкурсу — Гайнаўскі дом культуры — ужо трынаццаць гадоў заахвочвае да творчасці. Агляд выяўляе новыя таленты і з'яўляецца пачаткам мастацкай дарогі шматлікіх гайнаўскіх прафесійных творцаў. Сёлета ўпершыню паказалі жывапіс Славамір і Матэвуш Рыбакі — бацька і сын. Трынаццаты выпуск агляду быў для іх шчаслівым!

(мох)

Прыглядаўся

Нядаўна я дыскрэтна назіраў за „працай" механікаў Прадпрыемства ПКС у Беластоку, якога рамонтныя майстэрні знаходзяцца па вуліцы Юравецкай. Каля дзесятай гадзіны ў рамонтны бокс заехаў аўтобус. Праз некалькі хвілін выйшаў адтуль чалавек і накіраваўся ў напрамку блёка што па вуліцы Цёплай, 12. Там ён пераскочыў цераз плот і спачатку пайшоў у манапольку, а потым у прадуктовую краму. Зрабіўшы пакупкі зноў пераскочыў плот і вярнуўся ў рамонтны бокс. Да 13 гадзіны такое паўтарылася аж тры разы. Некалькі хвілін пасля 13 гадзіны ў тым жа месцы плот пераскочылі два мужчыны. Пайшлі ў манапольку, а потым у прадуктовую краму. Відаць было, што зрабілі большую пакупку. Калі першы мужчына пераскочыў плот, другі падаў яму торбу з пакупкамі і таксама пераскочыў плот. І яшчэ раз такое ж паўтарылася.

У 14.45 зноў мужчына пераскочыў праз плот, але ўжо не наведваў крамаў, відаць, пасля „цяжкога" рабочага дня падаўся дамоў адпачываць.

Цяжкое было гэтае назіранне за 8-гадзінным днём працы механікаў Прадпрыемства ПКС у Беластоку.

(лм)

Брама

Перад будынкам былой школы ў Старым Ляўкове (Гайнаўскі павет) стаіць вялікая драўляная брама з дашком, крытым гонтамі. Ёй каля 70 гадоў. Гэтыя вароты можна лічыць помнікам старадаўнасці. Зараз у дашку дзіркі, на гонтах зялёны мох.

Брама з'яўляецца арыгінальным архітэктурным аб'ектам у Старым Ляўкове. Захавалася яна ў памяці выпускнікоў стараляўкоўскай пачатковай школы, якія выехалі адгэтуль і жывуць у далёкіх гарадах у Польшчы, а нават за межамі нашай краіны. Браму неабходна адрамантаваць. Радныя з Новага Ляўкова — Янка Целушэцкі і са Старога Ляўкова — Юрка Равінскі пра гэта паклапоцяцца. Яны будуць ставіць гэтую справу на бліжэйшай сесіі Гміннай рады ў Нараўцы. **(мох)**

ЦАРКВА БУДУЕЦЦА

Праваслаўны прыход у сённяшняй Дуброве-Беластоцкай пачаў нараджацца ў пачатку 1980-х гадоў. І з таго часу датуецца будова дуброўскай царквы. Адным з вядучых прыхаджан, заангажаваных у царкоўнае будаўніцтва, з'яўляецца Мікалай Дземях.

— Пляц пад будову царквы, — кажа спадар Дземях, — атрымалі мы ад улад нашага горада бясплатна. Паставілі мы на ім будан, у якім трымалі будаўнічыя матэрыялы. І першыя службы там адбываліся. Служыў а. Мікалай Дайнека з Саколкі, які штоpазова даязджаў да нас. З часам прыход наняў у Дуброве кватэру і бацюшка перасяліўся сюды.

Спярша ўсе справы афармляліся ў Ячне, бо з гэтага прыхода быў выдзелены наш прыход. Важную дапамогу неслі нам таксама беластоцкія духоўныя, асабліва а. Аляксандр Хіліманюк многа дапамагаў нашаму маладому і неспрактыкаванаму ў будаўнічых пытаннях бацюшку. Архітэктар быў з Варшавы, а выканаўцам будаўнічых прац быў каталік з Беластока.

Спачатку трэба было нівеліраваць месца, бо Дуброва стаіць на ўзгорках. Часць цэглы бралі з мясцовай цагельні ў Каменнай, але большасць будматэрыялу было са знесеных даваенных беластоцкіх дамоў. І людзі шчыра паставіліся да стварання свайго прыхода. Быў энтузіязм і ахвярная дапамога з іх боку. Гэты запал стварыў добры клімат; людзі не шкадавалі ні працы, ні грошай, дзяжурылі па начах, пільнуючы будматэрыялы. Былі гэта галоўным чынам старэйшыя людзі, якіх ужо між намі няма. І так год за годам мы працавалі, царква расла. 23 лістапада 1986 года на дуброўскім храме былі ўстаноўлены крыжы.

Ставілі царкву са склепам і калі залілі на склепе столь, тады і набажэнствы сталі ў ім правіць. Пасля пабудавалі і плябанію. У Дуброўскі прыход былі выдзелены мясцовасці з прыхода ў Ячне: сама Дуброва, Ялова, Крапіўна, Вострава з калёніямі, Масціха, Бярвіха, Саломянка. Дуброўскі прыход налічвае сёння каля 1,2 тысячы душ у каля 300 сем'ях.

Клопатаў шмат, бо ж на ўсё патрэбны грошы. А людзі, калі не бачаць рыштаванняў, кажуць што нічога не робіцца і трацяць давер да будаўнікоў. А са сціплымі сродкамі клопаты буйнеюць. Вось для пабудовы іканастаса нанялі мы таннага старэйшага чалавека з Бельска-Падляшскага. Ён стаў рабіць іканастас, але не здолеў яго дакончыць, памёр. Пазней той іканастас крыху паправілі іканапісцы. Фрэскі ў нашай царкве чатыры гады таму сталі распісваць мастакі з Мінска; яны прыязджалі толькі на канікулы. Адзін з іх працуе ў вучэльні, а другі выехаў у Германію, бо з немкай ажаніўся; да нас прыязджае з Нямеччыны. У гэтым годзе іх у нас не было, бо не было ў нас грошай іх аплачваць. Сёлетнія грошы мы выдаткавалі на пакупку званоў. Заказалі іх у Тацішаве каля Глівіц, чатыры званы агульнай вагой у 1 660 кілаграмаў. Яны ўжо ў нас, іх 9 кастрычніка пасвяціў уладыка Іакаў і толькі трэба нарыхтаваць рыштаванні каб падвесіць іх. Званы каштавалі звыш васьмідзесяці тысяч злотаў. Некаторыя з парафіяльнай рады круцілі галовамі, што гэта занадта дарагі выдатак... І яшчэ ў гэтым годзе паклалі тратуар вакол царквы. Не ўсім прыхаджанам гэта спачатку падабалася, былі такія, што пыталі: „А навошта нам гэта, то ж і па траўцы можна прайсціся?.." Але калі тратуар паклалі, то і недаверкі нават былі задаволены, што прыгожа выглядае. Маставую для тратуара купілі ў Грыневічах каля Беластока, пастаўшчыкі на свой кошт прывезлі яе нам. А клаў тратуар мясцовы майстар, каталік, які таксама ўзяў за працу многа танней.

Царква ў Дуброве-Беластоцкай



Мікалай Дземях

Заклалі прыхаджане і ўласныя могілкі, на палях прылягаючай да Дубровы вёскі Стоцк. І таксама няма дастатковых сродкаў для іх добраўпарадкавання. Многа трэба хадайнічаць каб нейкую стаянку там наладзіць. Шмат захадаў спадар Дземях зрабіў у бурмістра, ён рады б быў пайсці прыхаджанам на найбольшыя ўступкі, але законы не заўсёды на гэта дазваляюць; ёсць клопаты з адвядзеннем вельмі зручнага для стаянкі ўчастка, бо гаспадаранне нават толькі яго геаметрыяй можа адбывацца выключна па вызначаных законам дарожках...

Мо гэтых клопатаў было б і менш, калі б не трагічны пажар мацярынскай царквы ў Ячне. Бо ж трэба было будавацца і тут, і там. У Ячне царква пастаўлена даволі спраўна, яна да таго ж вельмі вытанчанага дызайну. Ну і ставілася яна, як гэта гаворыцца, на намоленым месцы. А царква ў Дуброве расце на новым месцы, быццам раслінка на аблагу, дзе трэба перамагаць шмат клопатаў, трэба больш натугі.

Але клопаты, як гавораць людзі, існуюць дзеля таго, каб іх перамагаць. І ў Дуброве-Беластоцкай, хаця сілы не надта вялікія, змаганне з клопатамі ўсё ж такі адбываецца паспяхова. Беласценная дуброўская царква выдатна бачная ад поўначы і ўсходу горада, цешыць таксама вока пасажыраў паяздоў. І я ўпершыню ўбачыў яе калісь менавіта з акна поезда.

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

На беларускую зямлю

Паездка цёмнай ноччу на ўскраіну польскай краіны і еўрапейскай цывілізацыі. Дзякуй Богу гэта была ноч і ўсё размывалася ў цемры аранжавых вакзальных лямпаў. Вакзал у Кузніцы быў для нас своеасаблівым месцам пэўнай акліматызацыі, дзе магчыма сутыкнуцца з тыповым гродзенскім схамелым гандляром і месца, дзе магчыма яшчэ купіць польскае пастэрызаванае піва. Мяшаецца тут усё гэта, насычаецца адно ад аднаго смуродам.

23.45 — з'язджаем з Польшчы, а пасля некалькіх кіламетраў мы ўжо нібыта далёка, недзе ўжо каля 1.30 — пераскокнулі ў часе. Ужо мы дыхаем дзіўным ліпкім паветрам, гэта вакзал у Гродне. Прыйшлося нам тут начаваць. Вочы водзяць наўкруга, але бачаць толькі адно, толькі дрэннае. Ці гэта так? Чаму бачу толькі хлопчыкаў у цян-шаньскіх спартыўных касцюмах, дзяўчынкі без найменшай каплі густоўнай прыдумкі і толькі маскоўская гаворка наўкола. Гэта сапраўды напамінае тое, што бачна ў Белтэлебачанні, беларуская рэпрэзентацыя на еўраагляндзе песні, толькі пах і холад сталінскага вакзала ў Гродне адбіў ад гэтых думак. У гэты холад ноччу прыходзяць пагрэцца тут людзі, якім няважна хто і што, гэта бамжы, якія сапраўды даюць пачуццё спакою, толькі ад гэтых выкінутых па-за круг чалавецтва пачуў я беларускую мову, ну і гэты міліцыянер, добры чалавек — у яго ёсць пэўна жонка і дзеці.

4.25 — едзем цягнікам у Мінск, купэ а lá Бэст Вэстэрн Трэйн, шэсць гадзін на драўляных лаўках. Едзем сутыкнуцца чакана з кімсьці з немаскоўскім манерам. Ведаем, што там будуць нейкія беларусы.

Мы ў Мінску. Гэты аграмадны вакзал і гэтыя шырокія вуліцы. Не спімо ўжо амаль суткі. Сяброўка на вакзале — першая асоба, якая звяртаецца да нас па-беларуску — мо гэта выглядае як жах, але мы думалі аб тым, каб пачуць мелодыю гэтага цёплага беларускага слова — прывітанне. Вольга і Юра — нашы гаспадары, яны нібыта зусім з іншага свету. Гавораць і ўсё іншае робяць па і дзеля Беларусі, хаця дзяржаве не падабаецца іхняя маладая ініцыятыва дзеля падтрымкі беларускага духа. Гэта людзі непадобныя на сваіх суграмадзян з Гродна. Нібыта між Беластокам і Мінскам была зона „лапухоўшчыны". Дурна, але вопратка аб гэтым сведчыла, мова нібыта інтэлігенцкая. Бо дзіўныя часы надышлі. Гэтая мужыцкая беларуская мова стала інтэлігенцкай, а расійская стала папулярнай.

Купэ а lá Бэст Вэстэрн Трэйн

Чаго не чакаў а сустрэў тое, што там недзе сапраўды хаваецца беларуская моладзь, але не звычайная, толькі крэатыўная. Сутыкнуўся я з першакурснікамі, якія складаюць паэзію па-беларуску. Іхняя паэзія не сумавала па леце ці чырвоных і жоўтых лістах, але спявала вясёлыя праўды пра дуракоў і пра адчуванне сябе чалавекам сонца — Скарынаўскага сонца. Пачуў я гэта на канцэрце ў падвале касцёла, які даваў атмасферу, што ўсё наўкола ёсць беларускае і па-беларуску тут мне сапраўды добра і надзейна. Пасля ізноў выходзім на зямлю, беларускую, але дзіўна непрыхільную, пачуццё, што лепш было б сядзець там у падвале або ўжо каб усе беларусы пайшлі пад зямлю „з паннай Пяскоўскай", надышоў бы спакой душы. Здаецца, прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч, як мудрэц і слаўны менеджэр краіны, прадбачваў гэта і побач, непадалёк Палаца Рэспублікі, будуе аграмадны пограб, у які памесцяцца са тры згаданыя палацы. Людзі насміхаюцца з прыезджых вяскоўцаў, што там думаюць перанесці ўсё жыццё горада. „Дзівоса во такія, пане".

Вяртацца нам ізноў прыйшлося праз гэтую праклятую Гародню, і гэтым жа самым праклятым купэйным з дзікага захаду. Ізноў ночка ў Гродне, але акурат было каля 22.45 —вельмі цёплы пятнічны вечар. Вырашылі мы пайсці ў горад. Прыгожы стары горад (не пачуеш роднай мовы), прыгожы Нёман (не пачуеш роднай мовы), прыгожая Барысаглебская царква (не пачуеш роднай мовы), помнік побач яе ў падзяцы нашым прашчурам, што пабілі крыжакоў пад Грунвальдам і, гледзячы на гэта, закруцілася мне ў галаве пытанне: як выглядае цяпер Беларусь — ссаветызаваная, спаланізаваная? Ці трэба было біцца пад Грунвальдам, а не лепш згаварыцца зразу з крыжакамі, тады мо не было б II сусветнай вайны.

Першае — не паддавацца.

(ілo)

У чаромхаўскіх пажарнікаў

Чаромхаўская выратавальна-тушыльная пажарная каманда арганізавалася ў 1994 годзе, а дзейнічаць пачала пры канцы 1996 г. Вось што мне расказаў пра сваю часць старшы аспірант Кшыштаф Лянге:

— Каманда налічвае шаснаццаць пажарнікаў. Сваёй дзейнасцю забяспечваем тэрыторыю Чаромхаўскай, Кляшчэлеўскай і Дубіцкай гмін. Атрымалі мы два новыя аўтамабілі: у 1993 годзе „Форд-Транзіт" з прызначэннем для выратавальнай службы, варты 110 тыс. зл., а год пазней — тушыльны „Рэно-Міглюм" за 430 тыс. зл. У 1995 годзе Павятовая камендатура ў Гайнаўцы перадала цяжкі тушыльны аўтамабіль „Ельч 14". Фінансавыя сродкі на закупку новых аўтамабіляў былі паступілі з Ваяводскага фонду аховы асяроддзя ды з Ваяводскай і Павятовай камендантур ПСП. Было абмененае старое абсталяванне, перанятае ад завадской чыгуначнай пажарнай каманды на новыя. У 2003 годзе мы зарэгістравалі 139 здарэнняў, у 2004 — 350, у мінулым — 203, а сёлета — 178. У 2004 годзе ўзрасла колькасць здарэнняў па прычыне урагану, які летам праходзіў праз тэрыторыю Кляшчэлеўскай і Дубіцкай гмін. Найчасцей выязджаем да пажараў, але прыходзіцца ўдзельнічаць і ў дарожных аварыях, калі ўзнікае патрэба ратавання людскога жыцця. Карыстаемся таксама спецыялістычна абсталяваным аўтамабілем, — кажа камендант Кшыштаф Лянге.

— У час апошняй размовы Вы, здаецца, напаміналі аб мадэрнізацыі і разбудове пажарнага дэпо. Ці штосьці зрабілі ў гэтым напрамку?

— У мінулым годзе быў прад'яўлены праект у рамках праграмы „INTERREG 3 A", які тычыўся якраз гэтай справы. Вартасць праекта склала 911 380 зл. Праект быў адобраны і зараз знаходзіцца ў ходзе рэалізацыі. Канчаюцца работы па мадэрнізацыі старой часткі будынка дэпо. Тут будуць змяшчацца канторы і святліца. У мінулым годзе здалі мы ў карыстанне алейную кацельню. Для гэтага пакарысталіся мы фінансавай дапамогай гміннага бюджэту ў граніцах да 50 тыс зл. Заканчэнне работ прадбачваецца на палову снежня г.г. Афіцыйная перадача будынка для карыстання назначана на май 2007 г., калі традыцыйна адзначаюцца Дні пажарніка. У наступным годзе павятовая імпрэза з гэтай нагоды адбудзецца ў Чаромсе.

Калі я збіраўся развітацца, пазваніў тэлефон.

— Паміж Кляшчэлямі і Сухавольцамі лабавое сутыкненне двух аўтамабіляў — „Лянос" і „Фіат 126п". Патрабуецца каманда са спецыялістычным абсталяваннем.

Камендант падае сігнал. За некалькі хвілін каманда на сігнале падаецца ў дарогу. Пасля пятнаццаці мінут пажарнікі паведамляюць:

— Знаходзімся на месцы здарэння. Ёсць тут пажарная часць з Кляшчэляў і дзве машыны хуткай дапамогі. Адна ахвяра смяротная. Дзве паранены...

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Мінулае Валендзюкоў

У Валендзюках затаіўся важкі кавалачак нашай гісторыі. Яны знаходзяцца ў адным кіламетры за Сямятычамі, налева ад шашы, што ідзе ў напрамку ракі Буг і далей — у Сарнакі. Тут за будынкамі, у маляўнічай далінцы жвава бруіцца рачулка Камёнка. Над ёй даўным-даўно будавалі вадзяныя млыны. Спрычыніўся да гэтага значны нахіл плыні ракі і зручны доступ да яе. Звычайна на малых рэчках млыны мелі па адным коле. Пра іх у гэтай мясцовасці вядома ўжо з дакументаў ад 1580 года. Памяць пра „млынішчы" на берагах Камёнкі захаваліся і да сёння. Існуюць жа „млыновыя ўрочышчы": Туранка, Вэска, Карпінец, Паціева. У некаторых з іх, м.інш. у Паціеве і ў Туранцы перад першай сусветнай вайной было па два млыны.

Якраз млын у Вэсцы ды тры валокі зямлі і далі пачатак Валендзюкам. Сяляне з вёсак Вулька-Надбужная, Слохі-Аннопальскія, Крупічы і Турны малолі і пытлявалі ў млыне ў Вэсцы. Яны да рэформы 1861 года хадзілі на паншчыну ў маёнтак Аннопаль. Уладальнікі Аннопаля млын у Вэсцы здавалі ў арэнду.

Тутэйшыя жыхары, перш-наперш, Валендзюкі і Барвіюкі (гэтыя прозвішчы тут „родавыя"), вельмі дбалі пра добрага каня і воз. Яны вазілі драўніну з навакольных лясоў на бугскую бяндзюгу ў Турне, звозілі дровы ў кафлярні ў Сямятычах і ў Мілейчычах ды развозілі з іх кафлі па наваколлі. Яны ездзілі таксама за таварамі для крамароў у Беласток, Брэст, Пружаны.

(мох)

Гмінныя асфальтоўкі

Усе прыезджыя сцвярджаюць, што ў Нараўчанскай гміне вельмі многа асфальтавых дарог. За мінулыя восем гадоў на пабудову і мадэрнізацыю дарог гміна выдаткавала больш за 700 тысяч злотых. У бягучым годзе была асфальтавана вуліца ў Забалотчыне, а нядаўна залілі асфальтам большую частку вуліцы ў прыгранічным Масеве. Таксама сёлета закончана асфальтаванне павятовай дарогі з Плянты ў Семяноўку. У наступным годзе плануецца асфальтаванне вуліц у меншых вёсках, а таксама мадэрнізацыя пад'езда да Старога Двара пры Семяноўскім вадасховішчы.

Цяпер усе большыя вёскі ў гміне спалучаны цвёрдымі асфальтоўкамі. Людзі гавораць, што гэта заслуга войта Нараўчанскай гміны Мікалая Павільча, а таксама гмінных і павятовых радных.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Ганна Кандрацюк (redakcja@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

— 51 —

Зараз, ужо пасля поўдня ўсюды робіцца цёмна. Праўда, час перамянілі на зімовы, у сапраўднасці ўжо семнаццатая гадзіна, а не чацвёртая папоўдні. Гэтак толькі людзі падманваюць сябе і выкарыстанне электраэнергіі. Гражынка, ледзь вярнуўшыся са школы, адразу села за камп'ютэр. Нават не паела з толкам, бо ж абед у школе давалі яшчэ далёка да абеду. Схапіла талерку з бульбянымі аладкамі, лінула на іх смятаны, кінула на талерку відэлец... Узіраецца ў экран манітора, перабірае пальцамі па клавіятуры... Брынк! — зляцеў відэлец на падлогу, дык ухапіла блін дзяўчынка ў два пальцы, умакнула ў смятану дый праглынула... Важнейшыя ёй падзеі на экране, чым смакоце, яе ўлюбёнае, цёплае, хрумсткае, сакавітае!.. Грак сеў побач, дзеўбануў у блін.

— Ты што, не крычыш? — азваўся з поўнай дзюбай Грак.

— А? Чаго? — Гражынка ўзняла бліскучы ад тлушчу палец. — А кыш! Не еш майго!

Грак пракаўтнуў бульбяны камяк. І зноў умакнуў дзюбу ў талерку.

— Вельмі ж смачна. Мікітка, хадзі сюды, тут смятанкі даюць колькі хочаш. Кіс-кіс, ты ж так любіш смятанку!

— Люблю! — ускочыў на стол Мікітка, умакнуў у Гражынчыну талерку вусатую пыску. — Добр-р-р-рая смятанка!

— Добрая? — спахапілася Гражынка. — А гэта што такое робіцца? Мама, яны маё ядуць!!! Давайце мне новае!

— Ну, вось, глянь, Мікітка, ёй гідкія нашы дзюбы! — абразіўся Грак. — Гражынка, аддай нам, мы можам гэта ўсё з'есці!

Мама выглянула з кухні:

— А аладак больш і няма. Адно пяць тату пакінулі, жалезны рэзерв. Яго кранаць нельга. Я свае з'ела яшчэ з патэльні, бабуля ўмяла свае наляту, а твае, кажаш... брудныя? О, бачу, відэлец на падлозе! А чым ты ела аладкі?

— Лапкай, лапкай Гражынка брала аладкі! Нямытай лапкай! — Мікітка саскочыў са стала, палізаў сабе падушачкі далоні і стаў мыць сваю папэцкаваю ў смятану пыску.

— Лапкай, проста ў дзюбку! — удакладніў Грак.

— А сляды злачынства бачу я на клавіятуры! — заўважыла мама. — Мікітка, можа і тут паможаш?

Міра ЛУКША

Дарагая „Зорка"!

Пішуць Табе вучні Гімназіі з Нарвы. З нагоды 50-годдзя „Нівы" жадаем Вам многа падпісчыкаў. Гаворым: „Хай жыве «Ніва»!

23 кастрычніка г.г. вучні другіх і трэціх класаў, якія вучацца беларускай мове, пабывалі на экскурсіі ў Новым Беразове. Ужо на месцы сустрэліся мы з настаўніцамі і вучнямі Гайнаўскай белгімназіі. Спачатку мы пайшлі на шпацыр па вёсцы. Заглянулі ў царкву. Калі вярнуліся ў скансэн, гаспадары ўжо падрыхтавалі вогнішча. Ля кастра мы пяклі каўбаскі і грэліся (якраз гэты дзень быў халодны) ды знаёміліся з сябрамі з Гайнаўскай белгімназіі. Пасля невялікімі групамі аглядалі абсталяванне даўняй беларускай хаты, як і самую хату. Такой хаты, з даўнімі прыладамі, ужо няма ў нашых вёсках. Нам цікава было пабачыць калыску, гліняную печ, ложак з „пуховымі падушкамі"... Гэтая хатка прызначана для экскурсантаў. Побач яе стаіць і другая хатка, у якой жывуць турысты, якія прыязджаюць сюды на начлег, не толькі з Польшчы, але і з-за мяжы.

Зацікавілі нас таксама страусы. Кіраўнік скансэна вельмі цікава распавёў нам пра іх жыццё, харчаванне, гульні.

У час гэтай экскурсіі кожнага з нас штосьці заваражыла. Вось, што сказала наша сяброўка Кася:

— У Новым Беразове найбольш заваражыла мяне самая вёска. Яна разам з дзвюма цэрквамі, скансэнам, старымі хатамі і страусамі з'яўляецца цікавым месцам адпачынку. Думаю, што я, як турыстка, ахвотна хацела б тут пажыць некалькі дзён з вялікай карысцю для сябе. Не абазначае гэта, што заступіць мне скансэн таямнічае, цудоўнае мінулае, па якім тужаць мае бабулі, дзядулі, прадзеды, якім дадзена было жыць сярод бедных, але шчаслівых беларусаў.

А сяброўка Уля дадала:

— Шкада, што так хутка вярнуліся мы ў школу.

У кожнага з нас асталіся свае ўспаміны.

Гімназісты з Нарвы

Пазнаем алфавіт

Літара „Д"

Ішлі Чорны Мураш і Рыжы Мураш. Бачаць: пад хваінкаю літара „Д" сядзіць.

— Ты адпачываеш? — пацікавіўся Чорны Мураш.

— Па гэтай сцяжынцы раніцай хлапчук бег, — пачала расказваць літара „Д". — Бег, свой партфель угору падкідаў, забаўляўся.

— Свавольнік! — не сцярпеў Рыжы Мураш.

— Ён партфель падкінуў, а я не ўтрымалася і выпала з партфеля. Проста на сцяжынку ўпала, — паскардзілася літара „Д".

— І не падняў цябе хлапчук? — усклікнуў Чорны Мураш.

— Ён не заўважыў мяне, — паціху прагаварыла літара „Д". — Я сама за ім пабегла. Доўга бегла, стамілася. Ножкі забалелі... Не ведаю, што без мяне хлапчук у школе будзе рабіць.

— І слова „дом", і слова „дрот", і слова „дах" ён без цябе не напіша, — уздыхнуў Рыжы Мураш.

— Як мне ў школу хутчэй трапіць? Як? Ножкі баляць, — прамовіла літара „Д".

— Мы табе дапаможам, — сказаў Чорны Мураш. — Возьмем і панясём.

— Я вельмі цяжкая, не паднімеце, — кажа літара „Д".

— Давай мы цябе разбярэм, — прапанаваў Рыжы Мураш.

— Ды вы што! — жахнулася літара „Д".

— Не бойся, — суцешыў яе Чорны Мураш. — Мы цябе разбярэм, а каля школы збярэм. Быццам канструктар.

Хоць не хацелася гэтага літары „Д", але мусіла пагадзіцца:

— Разбірайце. Толькі каб пасля сабралі.

Разабралі сябры-мурашы літару „Д". Рыжы Мураш узяў ножкі, ніжнюю і верхнюю перакладзінкі, а Чорны Мураш — левую і правую бакавінкі.

Пакрочылі ў школу. Мінулі лясок, поле. Вось і вёска, на ўскрайку школа стаіць. Сталі мурашы, пачалі літару „Д" збіраць. Доўга працавалі. Аж спацелі. Вось як выйшла ў іх: Ꙗ.

— Не так, — сказаў Рыжы Мураш. — Яна ўверх ножкамі стаіць і зусім на літару не падобная.

Зноў пачалі збіраць. І зноў не выходзіць. Бяда. Селі сябры-мурашы і горка заплакалі.

Ляцеў Чмель, прысеў на кветку.

— Мурашы, чаго плачаце?

— Мы літару „Д" разабралі, — мацней заплакаў Чорны Мураш.

— Цяпер хочам сабраць, як канструктар збіраюць, ды не выходзіць у нас, — прамовіў Рыжы Мураш.

— Я дапамагу вам, — прагудзеў Чмель.

Спусціўся на зямлю, хутка, спрытна лапкамі запрацаваў. Хвіліны не прайшло — літара „Д" стаіць.

— Дзякуй! — крыкнула яна і пабегла ў школу.

А Чмель паглядзеў на Мурашоў і папракнуў:

— Літару „Д" не змаглі скласці! А яшчэ мурашы!

(працяг будзе)

Аляксей ЯКІМОВІЧ
„Займальны алфавіт"

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

— 8 —

Разам са снежнем у нашу школу завіталі кантрольныя. Бывае час, калі іх зусім няма і мы не пераймаемся школай. На жаль, цяпер мы мусім сядзець усю ноч і дзень ды зубрыць. Па гэтай прычыне я не магу чытаць кніжак і сядзець на *асьцы*. Але ёсць і такія, што ўвогуле не пераймаюцца навукай. Добрым прыкладам такога вучня — Міколка. Хлапец вяртаецца дахаты з панадворка ў дзесяць гадзін вечара, а пасля яшчэ доўга чыпіць ля камп'ютэра. Ніхто яму не зайздросціць ацэнак, наадварот, усе паказваюць на Міколку пальцам. Ну, але няма карысці і з навукі Сяргея. Хоць ён увесь час сядзіць у кніжках, але, на жаль, як і Міколка мае адны двойкі і адзінкі.

З маімі ацэнкамі таксама не найлепш. Апошнім часам я атрымала тройкі па біялогіі, матэматыцы, хіміі, англійскай мове і інфарматыцы. У Ганкі, Касі і Соні — вельмі падобныя вынікі.

Сапраўды, баюся думаць якую ўжо кару падрыхтуюць мне бацькі, калі вернуцца з бацькоўскага сходу?!

* * *

Сёння наш клас піша кантрольную па фізіцы. Я і мае сяброўкі не разумелі пройдзенага матэрыялу. І мы папрасілі дапамогі ў Марты, найлепшай вучаніцы ў класе, каб яна села ззаду за намі і дапамагла рашыць задачы. Марта так і зрабіла. Настаўнік фізікі, спадар Віснеўскі, у гэты раз нас не пільнаваў. Усе шапталіся, ардынарна перакідваліся шпаргалкамі. Я папрасіла Марту, каб яна дапамагла рашыць мне пятую задачу. Дзяўчына адарвала кавалак сваёй карткі і напісала мне поўны адказ. Я была шчаслівая і пачала спісваць змест. У гэты момант да Марты падышоў спадар Віснеўскі і вельмі зацікавіўся яе працай.

— А чаму ў цябе адарваны кавалак карткі? — спытаў ён.

— А... бо, — дзяўчына не ведала што сказаць, — я пісала і так чамусьці адарвала...

— Глядзі! Калі дзе знайду гэты кусок, тады закукарэкаеш!

Я адразу засунула шпаргалку ў кішэню і чакала пакуль спадар Віснеўскі адыдзе. Пасля... зноў пачала спісваць са шпаргалкі.

У гэты момант Ігар папрасіў дапамогі настаўніка, бо чагосьці не разумеў. Віснеўскі глядзеў у ягоны сшытак і адначасова схапіў мяне за руку. Ад нечаканасці я аж падскочыла! Настаўнік узяў тую няшчасную шпаргалку ды адразу дапасаваў яе да карткі Марты.

— Вось і бракуючае звяно! — захіхікаў ён.

У класе таксама ўсе смяяліся, вядома, апрача Марты і мяне. Мне было сорамна, што з-за мяне яна не атрымае шасцёркі. На свой рахунак я дапісала яшчэ адну дрэнную ацэнку. Я прадчувала, што ў гэты раз не змагу выцягнуць тройку!

тэкст:<Natasza9922@wp.pl>
дызайн:<lolcia@tlen.pl>

Галерэя „Зоркі" (Бельск-Падляшскі)

Каміла Сідарук

Фото Ганны Кандрацюк

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні: 5,9.

Твая мянушка: Мая мянушка „Кама", ад майго імя.

У жыцці хачу стаць, чаму: У жыцці я хачу стаць мастачкай, таму што вельмі люблю маляваць, а з малявання атрымліваю самыя пяцёркі і шасцёркі.

У сяброў цаню: У сяброў я цаню шчырасць і добры характар. Люблю, калі мае сябры гавораць праўду, любяць смяяцца і дапамагаюць іншым.

Не люблю: Я не люблю эгаістаў, сумных і ненасытных людзей, якім усяго мала. Як кожны вучань я не люблю прыбіраць у сваім пакоі і рашаць урокі.

Па-беларуску размаўляю з: Дзядулем і бабуляй, цёцяй, часам з бацькамі і настаўніцай беларускай мовы. Я вельмі люблю гэтую мову.

Мой любімы гурт: Я не маю любімага гурту. Слухаю англійскія, польскія і беларускія гурты, такія як „Ас" і „Прымакі".

Каля свайго дому пасаджу: Каля свайго дому я пасаджу белыя, чырвоныя і жоўтыя ружы, дзве яблынькі, грушку і чарэшню, бо я вельмі люблю садавіну.

Вершы Віктара Шведа

Святы шлюб

Запыталася Івона
Настаўніка Божага закона:
— Чаму не маем непакою,
Што шлюбнае жыццё святое?

Настаўнік адказаў на гэта:
— Няма ніякага сакрэту,
Залічваем шлюб да святога,
Бо маем мучанікаў многа.

Польска-беларуская крыжаванка № 49



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 45: Ты, бот, вар, важак, хор, рысунчак, матэматыка, шоўк, адамашка. Моц, жар, жытка, шасэ, кум, на, хатка, вочы, арак, ар, каша.

Узнагароды, фотаальбомы, выйгралі: **Кшыштаф Парфянюк, Маргарыта Яканчук, Іаанна Нявінская, Філіп Капацкі, Эвеліна Белаказовіч** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

Чый музей?

На агульны сход Аб'яднання „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы", які праходзіў 25 лістапада ў музейным будынку, не прыехалі яго члены з Беластока і Варшавы. Хутчэй за ўсё ў выпадку многіх асоб спрычынілася да гэтага нявырашаная справа ўласнасці музейных будынкаў, аб якой многа гаварылася ў час пасяджэння. Зараз юрыдычным уласнікам аб'екта з'яўляецца Галоўнае праўленне БГКТ, але ўдзельнікі з'езда пераконвалі, што амаль усе дакументы, пацвярджаючыя правядзенне будовы музея, выстаўлены на „Грамадскі камітэт пабудовы музея, помніка беларускай культуры і рэвалюцыйнага руху", які пасля пераўтварыўся ў вышэйзгаданае аб'яднанне. Судовая справа аб вяртанні аб'яднанню права ўласнасці музейных будынкаў, якая была ўзбуджана па ініцыятыве гайнаўскай арганізацыі, зараз спынена і зноў вядуцца перамовы з Галоўным праўленнем БГКТ у справе палюбоўнага вырашэння спрэчкі. У масмедыях паяўляліся таксама іншыя прапановы вырашэння справы ўласнасці музейных будынкаў і кіравання музейнай дзейнасцю. Свайго часу прафесар Аляксандр Баршчэўскі з Варшавы, якога вялікую дапамогу ў пабудове музея падкрэсліваў Канстанцін Майсеня, прапанаваў уключыць у нагляд за музейнай дзейнасцю прадстаўнікоў розных беларускіх арганізацый і асяроддзяў. Справа застаецца нявырашанай, але хутчэй за ўсё кіраваць музеем будзе арганізацыя, за якой будзе ўласнасць музейных будынкаў. Члены музейнага аб'яднання цвёрда вераць, што гэта яны стануць уласнікамі музея і таму рашаюцца далей праводзіць інвестыцыі ў будынках і вакол іх.

З'езд Аб'яднання „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы" распачаўся з ушанавання хвілінай маўчання памяці нядаўна памерлага галоўнага будаўніка музея Канстанціна Майсені. Старшыня праўлення аб'яднання Міраслаў Мордань прадставіў інфармацыю аб дзейнасці арганізацыі ад апошняга агульнага сходу. Звяртаў ён увагу на завяршэнне будаўнічых работ у музейных будынках і добраўпарадкаванне тэрыторыі вакол іх разам з будовай агароджы. Гаварыў пра рамонтныя работы, якія трэба было праводзіць у адміністрацыйна-канторскіх памяшканнях, інфармаваў пра купленую тэхніку, у тым ліку камп'ютэры і фотаапараты. Міраслаў Мордань напомніў пра пастаянныя выстаўкі і некалькі дзесяткаў часовых экспазіцый, гаварыў пра дэманстрацыю кінафільмаў і іншыя мерапрыемствы, ладжаныя ў музейных будынках і па-за імі. Прадставіў таксама канцэпцыю будовы побач музея невялікага скансэна, у якім мела б быць хата, прызначаная на беларускі клуб, і гумно, пераўтворанае на сцэну для мерапрыемстваў пад адкрытым небам. Міхал Байко прапанаваў арганізаваць пастаянныя экспазіцыі, якія паказвалі б гістарычную прысутнасць праваслаўя на беларускіх землях (гэтая справа разглядалася ў музеі ўжо раней). Прапановы працы з беларускім грамадствам па-за музеем удакладніў дырэктар установы Ян Карпюк, звяртаючы ўвагу на дэманстрацыю фільмаў у розных мясцовасцях і арганізаванне там музычных мерапрыемстваў. Міраслаў Мордань зачытаў прапанову праўлення аб'яднання, каб назваць музей імем Канстанціна Майсені. У адчытанай інфармацыі старшыня рэвізійнай камісіі, Уладзімір Іванюк пахваліў дзейнасць праўлення аб'яднання і дырэктара музея, не знаходзячы заган у дзейнасці музейных улад.

Так як і на папярэднім агульным сходзе ставілася справа прымання новых членаў. Асобы, якія склалі дэкларацыі яшчэ перад папярэднім з'ездам, былі прыняты прэзідыумам праўлення аб'яднання толькі на ўспамагаючых членаў і не былі запрошаны на сход. Віктар Бура прачытаў прозвішчы гэтых асоб, сярод якіх была, між іншым, жонка Канстанціна Майсені — Анастасія. Віктар Бура паінфармаваў, што Анастасія Майсеня была запрошана на агульны сход толькі напярэдадні з'езда па тэлефоне і выказала жаль па гэтай прычыне, а іншыя ўспамагаючыя члены не атрымалі ўвогуле запрашэнняў. Старшыня праўлення Міраслаў Мордань тлумачыў, што праўленне да часу вырашэння спраў уласнасці музейных будынкаў рашылася не прымаць у аб'яднанне новых звычайных членаў. Дырэктар Ян Карпюк тлумачыў, што не прадбачвалася запрашаць на агульны сход успамагаючых членаў. Паінфармаваў ён, што на 109 членаў арганізацыі, палічаных на папярэднім з'езде, лісты з запрашэннямі высланы былі да 103 чалавек (некаторыя памерлі). Рашэнне прэзідыума праўлення наконт ахвотных стаць членамі аб'яднання крытыкаваў Віктар Бура, патрабуючы дэталёвых паясненняў ад праўлення. Сярод непрынятых у звычайныя члены былі былыя павятовыя радныя выбраныя ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта і сямейнікі Віктара Буры.

— Патрэбная ўнутраная згода, бо музей памрэ разам з намі. Трэба нам маладых людзей, а мы тры гады не прымалі новых членаў, — заўважыў Славамір Кулік, але яшчэ да яго выступлення дыскусія наконт членства была спынена пасля афіцыйнай прапановы, падтрыманай большасцю галасуючых.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Удзельнікі агульнага сходу (справа): Віктар Бура, Алена Тапалянская, Васіль Сакоўскі, Альжбета Бура, Наталля Герасімюк, Нэля Шчука і Славамір Кулік

Віктар Бура зачытаў ліст Анастасіі Майсені да членаў агульнага сходу і новага праўлення аб'яднання. Жонка Канстанціна Майсені звярнула ўвагу на велізарную ангажаванасць мужа ў пабудову музея і вялікую фінансавую падтрымку інвестыцыі з іх боку. Прапанавала яна назваць музей імем Канстанціна Майсені і ўстанавіць мемарыяльную дошку на музейным будынку. Прасіла яна выдзеліць адну залу ў музеі для памятак і матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці ягонага будаўніка. У лісце яго аўтарка выказала жаль да папярэдняга праўлення і яго прэзідыума, што між іншым не запрашаў яе на з'езды і мерапрыемствы. Анастасія Майсеня прапанавала таксама сваю кандыдатуру на члена праўлення і намесніка старшыні.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Былы старшыня аб'яднання Міраслаў Мордань (злева) і юрыст, вядучы з'езда Мікола Клімюк

Віктар Бура ў час дыскусіі гаварыў, што не зроблена інвентарызацыя і ацэнка экспанатаў, якія захоўваюцца ў неадпаведных умовах. Казаў ён, што ў музеі няма кваліфікаваных кадраў для музейнай работы. Дырэктар Ян Карпюк адказаў, што яго вышэйшая адукацыя адпаведная да работы ў музеі, а Ян Хіліманюк тлумачыў, што пасля ацэнкі экспанатаў трэба будзе іх застрахаваць, што можа музей многа каштаваць. Міхал Голуб прапанаваў больш намаганняў паставіць на музейную работу.

Наталля Герасімюк, выкліканая да дыскусіі Віктарам Бурам, паскардзілася на дырэктара музея.

— Шмат мерапрыемстваў дырэктар забараняе рабіць, у адносінах да мяне прымяняе мобінг. Атрымала я ад яго вымову, якую суд скасаваў. Я ў 39 гадоў перанясла інфаркт і не хачу, каб гэта паўтарылася. Калі не зменяцца ўмовы працы, я буду вымушана адысці з работы, — заявіла бібліятэкарка Наталля Герасімюк.

У яе абарону выступіў былы настаўнік Гайнаўскага белліцэя Васіль Сакоўскі.

— Наталля Герасімюк — працавітая асоба, якая ўмела спраўляецца з абавязкамі. Яна добра ведае беларускую мову, з'яўляецца актыўным чалавекам і падтрымлівае кантакты з Беларуссю. Хаця яна ўпартая асоба, але такія людзі патрэбныя музею. Трэба прытупіць недаразуменні і пайсці на кампраміс, — гаварыў Васіль Сакоўскі.

Валянціна Клімук сказала, што калі б пісьмовая скарга на дырэктара была накіравана праўленню аб'яднання, яна разглядалася б і магло б не дайсці да такога недаразумення. У адказ Наталля Герасімюк паінфармавала, што пра свае праблемы расказвала старшыні праўлення Міраславу Морданю. На гэтым дыскусія ў справе бібліятэкаркі спынілася. Застаецца спадзявацца, што нававыбранае праўленне з увагай разгледзіць скаргу і выправіць справу.

Удзельнікі схода аднагалосна прынялі падрыхтаваную камісіяй праграму дзейнасці аб'яднання на наступны тэрмін. Прапануецца ў ёй, між іншым, прысвоіць музею імя Канстанціна Майсені, разважыць арганізаванне пастаяннай экспазіцыі прысвечанай жыццю і дзейнасці патрона. Прадбачваецца ўзбагачэнне музейнай калекцыі і пашырэнне яе прэзентацыі, а таксама давядзенне да станоўчых вырашэнняў у справе вяртання аб'яднанню правоў уласнасці на музейныя будынкі. Адначасна прапануецца праўленню вядзенне намаганняў у напрамку прымання новых членаў.

У тайным галасаванні ўдзельнікі схода выбралі праўленне з 15 чалавек і рэвізійную камісію. У склад праўлення ўвайшлі, між іншым, прадстаўнікі мясцовых улад — староста Гайнаўскага павета Уладзімір Пятрочук, бурмістр Анатоль Ахрыцюк, прадстаўнікі музейных улад — былы старшыня Міраслаў Мордань, яшчэ ранейшы старшыня Ян Хіліманюк, былы намеснік старшыні Ян Карчэўскі, іншы намеснік старшыні Ян Сухадола, дырэктар Ян Карпюк, вядомыя музейныя дзеячы Міхал Голуб і Аляксей Харкевіч. Сярод асоб, якія атрымалі найменш галасоў і не былі выбраны ў праўленне апынулася Анастасія Майсеня (была яна прынята на звычайнага члена аб'яднання старым праўленнем у час перапынку сходу). Прадбачваецца, што прэзідыум праўлення будзе выбраны на працягу тыдня.

Аляксей МАРОЗ

Беларускія выхадцы сталі ўзаемна сябе шукаць; і знаходзіць. У Брадфардзе сталі групавацца ў Згуртаванні беларусаў у Вялікабрытаніі. І я таксама запісалася. Сталі мы збіраць грошы на Беларускі дом. Бралі ў арэнду вялікі дом і там наймалі кватэры паасобнікам...

БРЫТАНСКІ БЕЛАРУСКІ ЛЁС

Успаміны Лёлі МІХАЛЮК, старшыні Згуртавання беларусаў у Вялікабрытаніі.

Нарадзілася я ў сялянскай сям'і ў вёсцы Лонскае на Шаркоўшчыне. Паспела пахадзіць па паўтара года ў польскую і савецкую школы. Пад немцамі школы не было, бо хаця былі настаўнікі, то яны баяліся вучыць у нас, у партызанскай зоне.

Калі наступілі немцы, яны занялі толькі мястэчкі; мы немцаў нават не бачылі. У нашу вёску трапіла многа палонных савецкіх байцоў, бо быў нямецкі загад, каб кожны гаспадар узяў аднаго да сябе на ўтрыманне. Спачатку было ціха, але пасля саветы сталі арганізавацца і ноччу выходзіць. Вельмі пілі і стралялі да мясцовага насельніцтва, калі хто ім не спадабаўся.

Тады немцы загадалі здаць байцоў да сябе. На гэта тыя саветы падаліся ў лес, яны балаганілі і ўсе іх баяліся. Аднаго чалавека ў чатыры гадзіны раніцы без прычыны забілі. У адной сям'і бацька загінуў ад іх, а сын — ад немцаў.

І наша сям'я пацярпела ад тых патрызанаў, бо ў нас раней беларус з украінцам жылі, якім мы памагалі. І да нас прычапіліся, каб мы аддалі ружжо, якое быццам тыя двух у нас пакінулі. Ад гэтай пагрозы мы былі прымушаны ўцячы ў Шаркоўшчыну. Пасля і іншыя нашы аднавяскоўцы пераехалі ў Шаркоўшчыну, бо нашу вёску спалілі; невядома, хто гэта зрабіў: партызаны ці немцы.

Перад адступленнем немцаў нам загадалі пакінуць Шаркоўшчыну і наша сям'я паехала з транспартам; не было відаць ні пачатку, ні канца калоны ўцекачоў, бо людзі ўвесь свой дабытак везлі. На ноч даехалі да Вільні, але ў горад мы не ўехалі, бо сталі бамбіць Вільню. А пасля заехалі аж у Гданьск, а там нас, не пытаючы ці мы хочам ці не, заперлі ў вагоны. Завезлі ў Берлін, які таксама кругласутачна бамбілі. Адтуль кінулі нас у іншыя абозы, а на канец размеркавалі па гаспадарах. Мы працавалі ў аднаго гаспадара, але ён вельмі дрэнны быў, нават да сваіх сямейнікаў адносіўся так, што яны нам дапамаглі ўцячы ад яго. Трапілі мы ў барак да нямецкіх уцекачоў, якіх дамы згарэлі і працавалі разам з імі.

Там нас застала капітуляцыя; мы не ведалі, хто заняў нашу тэрыторыю. Тыдзень часу пагаладалі і падаліся ў горад даведацца, хто там. Там былі амерыканцы, а мы не ведалі куды кінуцца, бо баяліся і рускіх, і польскіх.

Адзін добры немец, у якога раней працавалі нашы знаёмыя і які не належаў да нацыстаў, а цяпер стаў важным мясцовым чыноўнікам, запрасіў нас жыць у яго на месца выехаўшых італьянцаў і французаў. Мы пасяліліся ў яго. Быў гэта багаты чалавек — у адным канцы яго дома была ягоная рэзідэнцыя, а ў другім кіно, дзе амерыканскія салдаты тройчы ў тыдзень глядзелі фільмы.

Адзін з тых амерыканцаў спытаў мяне, чаму мы не вяртаемся дадому, а я адказала яму, што баімося саветаў. Тады ён сказаў, каб адтуль уцякаць, бо тую тэрыторыю мелі заняць менавіта саветы. Засцярог таксама, каб пра гэта не гаварыць немцам, бо і яны паўцякалі б.

Лёля Міхалюк

Але мы не мелі магчымасці ўцячы і сказалі нашаму гаспадару, што баімося. Ён адказаў, што гэта не тайна яму, ён сам будзе ўцякаць і забярэ нас з сабою. Мы папрасілі яго, каб дапамог нам трапіць у польскі лагер і ён нам дапамог. З таго лагера вывозілі ўсіх палякаў, што хацелі на Захад, і мы з імі паехалі ў вялікі іншы польскі лагер.

На новым месцы спаткалі знаёмых і палякаў, і беларусаў. Было там двух праваслаўных святароў, якія добра ведалі, што і дзе знаходзіцца ў Германіі. Я з імі з'ездзіла ў лагер Ватэнштэд і вярнулася.

— Свая там мова, свае там людзі, як у Беларусі, — сказала я маім сямейнікам.

І хаця ў польскім лагеры, які быў у амерыканскай зоне, было ўсяго дастаткова, мы паехалі ў Ватэнштэд, у брытанскую зону. Там спаткалі знаёмых са сваіх ваколіц. Я запісалася ў школу і пасля праверачных экзаменаў трапіла ў гімназію. Пазней займалася ў скаўцкай групе, танцавальным, вакальным і спартыўным гуртках. Так праходзіў час ад сёмай гадзіны раніцы да шостай вечара; вельмі прыемна было тады.

У 1947 годзе набіралі ахвотных на працу ў Вялікабрытанію; мы забраліся другім транспартам. Наша сям'я трапіла ў Брадфард, недалёка Лідс. Мне было 17 гадоў і я стала на працу ў тэкстыльную фабрыку.

Беларускія выхадцы сталі ўзаемна сябе шукаць; і знаходзіць. У Брадфардзе сталі групавацца ў Згуртаванні беларусаў у Вялікабрытаніі. І я таксама запісалася. Сталі мы збіраць грошы на Беларускі дом. Бралі ў арэнду вялікі дом і там наймалі кватэры паасобнікам. Гэтак рабілі і асобныя сем'і; так збіралі грошы. У Брадфардзе мы, беларусы, купілі дом, там абсталявалі капліч-ку, там праходзіла наша грамадскае жыццё. Гэтаксама беларусы арганізаваліся і ў недалёкім Манчэстэры.

Там пазнала я свайго мужа, за якога выйшла замуж у 1949 годзе. Ён быў вельмі адданы беларускай справе, ставіў яе перад сямейнаю, а я з ім пагаджалася, бо мы былі аднаго погляду. Адна англійка пазычыла нам грошы на невялікі працэнт і мы купілі сабе дом. Нарадзілася ў нас трох сыноў.

Пазней сталі мы сыноў пасылаць у Лондан; там пры каталіцкай місіі быў інтэрнат. Дзеці вучыліся ў англійскіх школах, а па уік-эндах вучыліся беларускасці; настаўнічалі Гарошка, Германовіч і а. Надсан. Калі ў Лондан паслалі апошняга сына, а. Надсан запрапанаваў мне працу ў інтэрнаце. Я згадзілася на год, але працавала там пяць гадоў. Прадалі мы свой дом у Брадфардзе і перасяліліся ў сталіцу; пасля ўдалося нам купіць дом у Лондане, недалёка інтэрната. Мая мама стала хварэць і трэба было яе даглядаць; трэба было змяніць працу. Я стала на работу ў магазін, дзе перапрацавала шаснаццаць гадоў.

Спачатку нас, беларусаў, было ў Вялікабрытаніі многа, але ўжо ў канцы 1950-х гадоў больш адукаваныя сталі выязджаць у Злучаныя Штаты і Канаду. Але рабілася шмат. Быў дабрачынны фонд, які працуе дагэтуль, дзейнічала Англійска-беларускае таварыства. Прэзідэнтам Таварыства была Катрын Макмілін, нявестка тадышняга прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі Гаральда Макміліна. Сэр Абэрон быў з каралеўскай сям'і, ён вывучыў беларускую мову, а калі паміраў, то зажадаў, каб яго ўладыка Сіповіч пахаваў у славянскім абрадзе. Вялікім нашым прыяцелем быў сэр Герберт, у якога мы праводзілі летнія канікулы; ён нам многа дапамог.

У Вялікабрытаніі было тры беларускія дамы: у Лондане, Манчэстэры і Брадфардзе, але два апошнія давялося прадаць, бо не асталося там беларусаў. А ў Лондане жыве беларускі рух, прыязджаюць людзі з правінцыі, але мала нас асталося. Нашы дзеці параз'язджаліся, пажаніліся з іншымі. З нашых сыноў толькі наймалодшы ажаніўся з беларускай і жыве ў Лондане, пры іх астаюся і я. А старэйшыя сыны пажаніліся з іншымі: адзін жыве ў Шатландыі, а другі за граніцай...

Цэлы час трымаем кантакты з беларусамі Захаду: з Аўстраліі, Францыі, Бельгіі... Раней выдавалі часопісы „Беларус на чужыне", „На шляху", пазней далучыліся да „Бацькаўшчыны", што выходзіла ў Нямеччыне. Раней выдавалі кнігі, а цяпер дапамагаем толькі выдавецкай справе ў Беларусі. Па ініцыятыве ўладыкі Сіповіча былі заснавалі ў Лондане бібліятэку, чыста беларускую; яна працуе надалей. Калі старэйшыя эмігранты сталі хварэць, яны апісвалі свае дамы Згуртаванню... У Англіі існавалі беларускія прыходы, каталіцкія і праваслаўныя. Цяпер асталася толькі царква ў Манчэстэры, якую мы купілі ў 1950 годзе і яна пустуе...

Мой муж у пачатку 1970-х гадоў стаў старшынёю Згуртавання беларусаў у Вялікабрытаніі і аставаўся ім дваццаць пяць гадоў. У Лондане застала нас незалежнасць. У 1993 годзе мы выбіраліся на І з'езд беларусаў свету. Але тады муж захварэў, трапіў у шпіталь, яму аднялі дзве нагі. Пажыў ён яшчэ два гады і ў 1995 годзе памёр.

Яшчэ тады быў стары актыў ЗБуВБ, але зараз пасля майго мужа памёр ягоны намеснік, спадар Станковіч, пасля скарбнік спадар Асіповіч, спадар Лашук... З таго старэйшага пакалення асталася я і ў 1997 годзе абралі мяне старшынёй Згуртавання. І трэба было дабіраць новых людзей да беларускай працы. Цяпер да нас далучылася новая эміграцыя, людзі адукаваныя. Гэта малодшае пакаленне, яны то на працы, то сем'ямі займаюцца, мо некаторыя хочуць вярнуцца ў Беларусь. Але я маю надзею, што пяроймуць ад мяне грамадскую працу на беларускай ніве і пацягнуць яе далей.

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

http://tbm-vileyka.iatp.by

Невялікія беларускія мястэчкі ў нечым падобныя ўласна на Беларусь. Як і беларуская краіна ў Еўропе, яны нібыта знаходзяцца недзе на ўзбоччы цывілізацыі. Але іхняя правінцыйнасць яшчэ не дае падставы сцвярджаць, што нават там няма грамадска актыўных людзей, якія не лічылі б сябе зусім адарванымі ад сусветных працэсаў і якія былі б не супраць, каб пра іх даведалася як мага больш народу. І часцяком такая праца вартая расповеду аб ёй.

Сёння мы зазірнем на сайт, які дасць нам сякое-такое ўяўленне аб жыцці Вілейкі — невялікага гарадка, што месціцца на поўнач ад беларускай сталіцы. Гэта сайт мясцовага аддзялення Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны.

Каб выйсці на даны партал, трэба набраць на сваім камп'ютэры адрас у Інтэрнэце: http://tbm-vileyka.iatp.by. Перад нашымі вачыма адкрыецца прывабнае выяўленне, аздобленае гербам Вілейкі, эмблемай ТБМ і колерамі нацыянальнага сцяга, на фоне якіх і месціцца назва — „Вялейская раённая арганізацыя ТБМ імя Ф. Скарыны". Чаму мясцовыя аматары беларускай мовы пішуць „вялейская" замест „вілейская" адказаць цяжка. Але, відаць, яны лепей за іншых ведаюць як правільна трэба пісаць і вымаўляць назву іх роднага мястэчка і вытворныя ад яе.

Першая старонка сайта, яна і галоўная, падзяляецца на дзве няроўныя часткі. У першай, злева, месціцца не выйсці на іншыя старонкі, а банэры вартых для наведвання, на думку распрацоўшчыкаў сайта, іншых Інтэрнэт-бачын. Большая, правая частка выяўлення аддадзеная пад навіны. Не да гонару распрацоўшчыкаў, абнаўляецца яна нячаста. Ну, а шэраг апошніх навін тычацца, з большага, музычных падзей, якія ў той ці іншай меры мелі дачыненне да вілейскіх меламанаў.

Рубрыка „Праекты" не зусім зразумелая. Там няма ніякага расповеду аб тым, хто ёсць натхняльнікам і распрацоўшчыкам праекта „Інфармацыйны сайт Вілейкі". Гэтая рубрыка ёсць папросту выйсцем да аднайменнага сайта.

Падаецца, што вілейская зямля ніколі не была бедная на выдатныя асобы. Але, калі зазірнуць на старонку з такой назвай, то падрабязны расповед, аздоблены фотаздымкамі, ёсць толькі аб Эміліі Кунавіч, польскай пісьменніцы і мастачцы, якая працавала калісьці настаўніцай у тамтэйшых мясцінах. Па ўсім відаць, што сябрам вілейскай арганізацыі ТБМ варта больш удумліва падыходзіць да насычэння інфармацыяй гэтай старонкі, бо яна ёсць не толькі адлюстраваннем падзей, звязаных з выдатнымі асобамі, але і паказвае якую руплівасць праяўляюць мясцовыя патрыёты да зберажэння памяці сваёй малой радзімы.

Сярод выйсцяў да рубрык, якія, дарэчы, месцяцца акурат пад назвай сайта, ёсць і „Зваротная сувязь". Чамусьці многім распрацоўшчыкам і ідэйным натхняльнікам сайтаў не хочацца распавядаць аб сабе. Чым гэта абумоўлена, здагадацца цяжка, але пададзеныя ў падрубрыцы „Кантакты" каардынаты дазваляюць наведвальніку сайта толькі спісацца па электроннай пошце альбо пазваніць па тэлефоне невядомым вілейскім аматарам беларускага слова.

Сярод вартых увагі інфармацый, змешчаных на сайце, варта адзначыць рубрыку „Пампуй", дзе можна спампаваць музыку некаторых выканаўцаў, а таксама перанесці на лазерны дыск электронныя версіі мясцовых газет.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Ад вялікага да малога

Пераканаўчай перамогай беларуска-шведскага дуэта Максім Мірны — Юнас Б'ёркман скончыўся фінальны тэнісны турнір серыі „Мастэрс", які прайшоў у кітайскім Шанхаі. Інтэрнацыянальная пара (а такіх у эліце палова) прайшла без паразаў усе матчы вельмі прэстыжных спаборніцтваў. У фінале Мірны і Б'ёркман упэўнена (6:2, 6:4) адолелі трэці дуэт па рэйтынгу, які складалі багамец Марк Ноўлз і канадзец Даніэль Нестар. Апошні знаёмы заўзятарам айчыннага тэніса яшчэ з матча Кубка Дэвіса Беларусь — Канада. У выніку „чэмпіёнскай гонкі" 2006 года Максім і Юнас занялі другое месца (1 151 ачко), зусім няшмат саступіўшы амерыканцам — братам Браянам (у іх 1 180 пунктаў).

Цікава, што ў лютым 2007 года сябры Мірны і Б'ёркман стануць на корце супернікамі. У 1/8 фіналу Кубка Дэвіса Беларусь будзе прымаць якраз Швецыю. У Мірнага з прадстаўнікамі гэтай скандынаўскай краіны вельмі адмоўныя паказчыкі асабістых сустрэч, а менавіта з Б'ёркманам зусім катастрафічныя — 1:9. З іншага боку, па тэорыі імавернасці, чаму б не выйграць менавіта ў наступным спатканні?

Ад вялікага тэніса пяройдзем да малога. Насычаным выдаўся лістапад для айчынных майстроў малой ракеткі. На адкрытым чэмпіянаце Нямеччыны ўзнагароды абмінулі нашых. Яўген Шчацінін, які выступаў пасля доўгага залечвання траўмы, прайшоў кваліфікацыю, але затым саступіў 3:4 моцнаму сінгапурцу. Уладзімір Самсонаў гэты турнір прапусціў. Вікторыя Паўловіч нечакана выбыла ўжо ў першым крузе, а яе сястра Вераніка прайграла ў другім. У парных намінацыях нашы таксама не вызначыліся.

А вось на першынстве Польшчы беларусы ўзялі два медалі. Уладзімір Самсонаў у фінале змагаўся з Цімам Болем. Толькі гэтыя два еўрапейскія майстры стаяць на роўных з прадстаўнікамі азіяцкай школы. Што датычыць асабістых дуэляў, то на гэты раз верх узяў немец (нядаўна на куды больш значным Кубку свету перамог Уладзімір). У беларуса цяпер у кішэні засталося срэбра. Сезон для Самсонава (5-я ракетка свету) завершыцца ў снежні так званым турнірам чэмпіёнаў, дзе выступяць 8 мацнейшых майстроў планеты.

На жаль, не змог выйсці з групы ў асноўную сетку Віталь Нехвядовіч. Яшчэ адзін прадстаўнік Беларусі Павел Платонаў выявіў моцныя якасці і крыху толькі не дацягнуў да „асновы". Сёстры Паўловіч у адзіночным разрадзе выступілі непераканаўча, а ў парным апынуліся па розны бок стала. Больш пашанцавала Вікторыі — у пары з расіянкай Святланай Ганінай яна стала бронзавай прызёркай.

Далей былі матчы кваліфікацыйных турніраў камандавага еўрачэмпіянату. Нашы хлопцы, як гаворыцца, без варыянтаў, прайгралі ў Маскве — 0:3. Папярэднія дзве сустрэчы перамагалі беларусы, але на гэты раз расіяне ўзялі рэванш. Тым не менш, шанцы для выхаду ў фінальную частку застаюцца. Для гэтага патрэбна адолець у апошнім матчы дома іспанцаў.

А беларуская жаночая дружына перамагла ў Мінску з лікам 3:1 аўтсайдара групы — Украіну. Прычым пачалі сустрэчу з паразы — зноў нечакана прайграла наша першая ракетка Вікторыя Паўловіч. Аднак затым Вераніка Паўловіч, Аляксандра Шувалава і нарэшце Вікторыя Паўловіч прынеслі тры запаветныя ачкі (што цікава, усе матчы нашы выйгралі з лікам 3:1). Пасля гэтага жаночая зборная забяспечыла выхад у фінальную стадыю еўрачэмпіянату.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Вечар беларускай культуры

17 лістапада ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку па вул. Святога Мікалая, 5, адбыўся „Вечар беларускай культуры". Сарганізавалі яго Пасольства Беларусі ў Польшчы, Генконсульства Беларусі ў Беластоку пры садзейнічанні Беларускага грамадска-культурнага таварыства і Цэнтра праваслаўнай культуры ў Беластоку.

Вечар сабраў сяброў і аматараў роднай культуры, пачынаючы ад маленькіх выступоўцаў з беларускіх аддзелаў польска-беларускага дзіцячага садка н-р 14 у Беластоку (яны выступілі і з вершамі, і з песнямі) да сівых ветэранаў беларускага руху ў Польшчы. На вечары прысутнічалі епіскап Беластоцкі і Гданьскі Іакаў, дэпутаты Сейма Польшчы і Падляшскага сейміка, кіраўнікі дзяржаўных і грамадскіх арганізацый ваяводства і горада, мясцовых органаў самаўрада, архімандрыт Супрасльскага манастыра Гаўрыіл, іншыя прадстаўнікі Праваслаўнай царквы, м.інш. браты Уладзімір і Рыгор Місеюкі. Асноўнай падзеяй вечара было адкрыццё мастацкай выстаўкі дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзіміра Пракапцова і супрацоўніка Нацыянальнай бібліятэкі Паўла Пракапцова, на якой было прадстаўлена больш за 40 сучасных мастацкіх твораў. У вечары прынялі ўдзел таксама беларускі паэт, дырэктар замежнай радыёстанцыі „Беларусь" Навум Гальпяровіч і загадчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры прафесар Вера Пракапцова, якія прэзентавалі свае кнігі. Можна было таксама пазнаёміцца і набыць выданні выдавецтва „Беларускі экзархат", музычныя запісы беларускіх калектываў, паглядзець відэафільм „Серафімавы браты".

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Навум Гальпяровіч і дашкольнікі

Удзельнікамі вечара была прадстаўлена багатая канцэртная праграма — ад бойкага ды патрыятычнага выступення малых мастакоў-дашкольнікаў, праз вядомых падляшскіх музыкаў да ўспрынятага як заўсёды энтузіястычна на Беласточчыне слонімскага ансамбля „Грымата". Ад імя Пасольства і фірм „Drobiarstwo-Działy Specjalne" і „Inwest Argo" дзіцячаму садку былі ўручаны сучасны плазмавы тэлевізар і DVD — не першы гэта падарунак гэтаму садку ад фірм з цэнтральнай Польшчы.

Прыязная, свойская мілая атмасфера вечара, завершанага багатым пачастункам беларускімі стравамі, пацвердзіла словы выступаючых у час адкрыцця вечара епіскапа Іакава, пасла Беларусі ў РП Паўла Латушкі, старшыні БГКТ Яна Сычэўскага, архімандрыта Супрасльскага манастыра Гаўрыіла і іншых аб „значэнні супольнай спадчыны ў фарміраванні добрасуседскіх беларуска-польскіх адносін ды ролі беларускіх мерапрыемстваў для беларускай меншасці і развіцця плённых польска-беларускіх культурных сувязей".

Беларуская дэлегацыя і прадстаўнікі пасольства сустрэліся таксама з кіраўніцтвам Падляшскага музея і Супрасльскага манастыра ды БГКТ, у час якіх былі абмеркаваны пытанні далейшага супрацоўніцтва і правядзення беларускіх мерапрыемстваў на Беласточчыне.

(лук)

Ці амалодзіцца сяло?

Рэпіскі наведаў я ў будны дзень. На вуліцы бачны былі мужчыны малодшага і сярэдняга ўзросту на трактарах з сельскагаспадарчымі машынамі. Здараецца, што гарадскія земляробы завіхаюцца на палетках па суботах, у вольны ад асноўнай працы час. Тады вяртаюцца яны ў бацькаўскія хаты і займаюцца самымі пільнымі гаспадарчымі працамі. Хаця малодшых сем'яў у вёсцы мала, то ў трох з іх нарадзілася пад дваццаць дзетак. Яны ў асноўным амаладзілі сяло.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У Рэпісках ёсць яшчэ каля 50 дамоў, але частка сярод іх пустуе, а ў іншых жывуць адзінокія ўдавіцы. Адзін дом ужо развальваецца, другі зарастае кустамі. Пустыя хаты стаяць таксама на двух хутарах. Старэйшыя гаспадары сталі перасяляцца з іх у сяло, бо цяжка было ім даехаць у вёску.

— Праз кожныя некалькі дамоў стаіць пустая хата. Старыя людзі вельмі хутка паміраюць. У дзевяностых гадах здарылася, што на працягу аднаго года было ў сяле ажно дванаццаць пакойнікаў, — кажа Марыя Федарук.

Малодшыя гаспадары, якія асталіся жыць дома, заняліся жывёлагадоўляй. Абмежавалі яны гадоўлю свіней, або ліквідавалі яе па прычыне нестабільнасці цэн на свініну. Гаспадары, якія павялічылі гадоўлю кароў, абрабляюць таксама палі суседзяў-пенсіянераў.

— Найбуйнейшы жывёлавод трымае каля 20 кароў. У іншых прыблізна па 10 кароў. Да гэтага трэба яшчэ дабавіць маладняк. Няма ў нас гаспадароў, у якіх было б вельмі многа поля, — расказвае Міхал Федарук.

Дзеці пенсіянераў выехалі з Рэпіскаў у гарады. З'яўляюцца яны ўласнікамі поля, якое абрабляюць разам з бацькамі, калі апошнім гэта яшчэ пад сілу. З дапамогай дзяцей і ўнукаў рамантаваліся апошнім часам хаты, якія хутчэй за ўсё стануць дачамі.

— З нашага боку вёскі многа зямлі падыходзіць пад аблясенне. Калі мы гаспадарылі, часта было ў нас мокра або ўраджай нішчыла засуха. Вінавата была гліна, якая залягае пад паверхняй зямлі. Мы нават частку горшага поля прадалі. Некаторыя суседзі пакінулі поле аблагом або сталі яго аблясяць, — заяўляе спадар Федарук. — З другога боку сяла зямля лепшай якасці, на якой можа расці нават пшаніца. Там была праведзена меліярацыя, якая дазваляе ўваходзіць на поле з сельскагаспадарчымі работамі спачатку вясны.

Гаспадар, якога я сустракаю на вуліцы, спяшаецца да сельскагаспадарчых работ. Ён гадуе кароў, а гадоўля свіней, якой займаўся бацька, выдатна абмежаваная.

— У агульным у нас землі слабейшай якасці і таму цяжка было б разлічваць толькі на прыбытак ад раслінай вытворчасці, — гаворыць Марк Паўлоўскі.

Гаспадары пад вечар спяшаюцца, каб на час выдаіць кароў.

У Рэпісках яшчэ вядзецца скупка малака і таму гаспадары не пакідаюць гадаваць кароў.

— Прасілі, прасілі і выпрасілі ў Акруговым малочным кааператыве, каб дазволілі прымаць малако ў іх будынку, — кажа спадар Міхал Федарук. Рана і вечарам гаспадары сустракаюцца ў вясковай малачарні і абмяркоўваюць тут вясковыя і сямейныя справы. У невялікім сяле людзі ведаюць аб радасцях і клопатах сваіх суседзяў, але гутарка часта сыходзіць і на справы дзяржаўнай палітыкі вядомыя ім з тэлебачання. Людзі з Рэпіскаў мала чытаюць мясцовыя газеты і таму менш гавораць пра мясцовую палітыку.

— Была бяда з нашай даязной дарогай, якая спалучае шашу Гайнаўка — Нарва з вёскай. Пасля дажджоў цяжка было праехаць па ёй на машыне, — кажа мужчына сярэдняга ўзросту і дадае, што апошнім часам была яна рамантаваная. — Хаця якасць новай паверхні не такая, як нармальнай асфальтавай дарогі, то палёгка вялікая.

Раней жыхары Рэпіскаў прадавалі сваю зямлю, але апошнім часам, пасля ўвядзення даплатаў да сельскагаспадарчай прадукцыі, абарот зямлёй спыніўся.

— Поле куплялі ў нас нават жыхары Беластока, — кажа мой субяседнік.

Жыхары Рэпіскаў задаволены, што распачаўся рамонт школьнага будынка, які пуставаў і нішчэў.

— Нашу школу ліквідавалі яшчэ ў сямідзесятых гадах. Пасля быў адчынены ў ёй клуб і людзі сталі прыходзіць паглядзець тэлевізар. Геэсаўскі магазін знаходзіўся ў прыватных дамах, а пасля яго ліквідацыі, у школьным будынку працаваў прыватны магазін. Пазней будынак пуставаў і моцна знішчыўся, — тлумачыць Міхал Федарук. Прадбачваецца, што ў адрамантаваным у наступным годзе школьным будынку будзе адкрыты вясковы клуб.

Водаправод даведзены быў у Рэпіскі даўно.

— Малодшыя людзі парабілі ў нас ванныя, а старэйшыя проста бяруць ваду, якая трубамі даходзіць да нас ажно з Новага Беразова. Каналізацыя ўжо хіба не будзе нам патрэбная, бо людзі ў нас старыя, — разважае спадар Федарук.

— Больш маладых людзей аставалася б на гаспадарках, каб лягчэй можна было прадаваць сельскагаспадарчыя прадукты і каб за іх лепш плацілі, — гаворыць мужчына сярэдняга ўзросту. — Цяпер трэба прадаць дзве або тры тоны жыта, каб купіць тону мінеральных угнаенняў, а калісь было наадварот.

Маладых сем'яў у вёсцы мала, але ў дубінскую школу давозяць на гмінным аўтобусе яшчэ каля 10 вучняў. Толькі ў дзвюх сем'ях ёсць каля 15 дзяцей, але частка іх дабіраецца ў школу ў Гайнаўку. Дзеткі адной шматдзетнай сям'і выехалі з Рэпіскаў на часовае жыхарства ў іншае месца. Многія вучні з Рэпіскаў ходзяць на заняткі беларускай мовы, але выхаванне дома будзе мець галоўнае ўздзеянне на іх нацыянальную свядомасць.

— Гарадскія дзеткі, якія прыязджаюць па суботах да бабуль за свойскім хлебам, размаўляюць ужо на польскай мове, але добра, што хаця разумеюць, калі да іх гаворыцца пасвойму, — кажа спадар Федарук. — „Ніва" з календаром у нашай хаце здаўна. Іншыя жыхары нашага сяла таксама яе купляюць.

Калі пытаю пра заняткі жыхароў Рэпіскаў па-за сельскай гаспадаркай, мой суразмоўца кажа, што ў вёсцы ёсць адзін дрэваапрацоўчы варштат.

— У сталярні вырэзваюцца з дрэва нейкія дошчачкі. Мой сусед даязджае на працу ў Гайнаўку, а іншы жыхар нашай вёскі працуе пісьманосцам, — расказвае Міхал Федарук.

Аляксей МАРОЗ

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Парадак

Каб на Усходняй сцяне
Парадак зрабіць,
Трэба вельмі многа
Тут грошай улажыць.

У кожнай вёсцы трэба
Заезд пабудаваць,
Каб кожны турыст
Мог годна адпачываць.

І дарогам трэба
Мадэрнізавацца,
Каб замежны турыст
Мог імі карыстацца.

За ўсё гэта трэба
Самаўрадам узяцца,
Каб там, на вярхушцы,
Кінулі смяяцца.

Ды каб перасталі
Манголамі вас зваці,
Трэба крыху лепшы
Вам парадак трымаці!

У вёсцы і па дарогах
За парадак узяцца —
Тады з нашых гмінаў
Не будуць смяяцца.

Паездзіць па гміне,
Усё добра распазнаць,
Чаго людзі хочуць —
Трэба тое даць!

Не сядзець у куточку,
Для свае выгоды,
А зрабіць справаздачу,
Што правялі сходы.

За праўду!

Авантура ёсць у гміне
І ў цэлай нашай краіне:
Улада пра людзей не дбае,
Сабе крэслы падбірае!

Ідзе афёра за афёрай
(Была сёння, была ўчора!),
Нам аб гэтым трэба знаці,
Аб афёрах больш пісаці.

Ды каб улады не баяцца,
Можа штось тады ўдацца,
Хоць мы астаемся ззаду,
Лічаць нас чацвёртай уладай.

Трэба ўсім аб гэтым знаці,
Ў „Ніве" праўду нам пісаці,
І за праўду нам змагацца —
Будуць улады нас баяцца!

Пісаць аб бракаробах
(Хай на іх усіх хвароба!):
Ад карыта ўсіх пагнаці,
Дабро ў дзяржаве будаваці!

Бо на гэтых бракаробаў
Няма смерці ні хваробаў,
Сваіх людзей усюды пхаюць
Ды жыццё нам атручаюць!

Тады можа, мае мілы,
Будуць людзі ўсе шчаслівы,
Будуць нам падзяку слаці,
Як праўду будзем выяўляці.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2007 r. upływa 5 grudnia 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 2000 egz.

Суседскія былі

ЛЕБЯДЗІНАЯ ПЕСНЯ

Пасля таго як вясковыя дзеці закідалі ўсё возера наламаным хлебам і з крыкамі: „Вунь, глядзі, яны зноў выплылі!" перашкаджалі вудзіць рыбу, Генадзь Гур'ян яшчэ цярпеў белую пару лебедзяў, невядома адкуль прыляцеўшых на іх вадаём. Але калі дарослыя, асабліва тыя, разадзетыя ў белыя кашулі франты, якія даўно ўжо пакінулі вёску, абзавяліся ў горадзе кватэрамі, машынамі і сем'ямі, і прыязджалі да старых бацькоў выключна для таго, каб вярнуцца ў свет шкла і бетону з пяццю мяшкамі бульбы, свінымі кумпякамі і грашыма, атрыманымі за бычка, якога яны так і не ўбачылі пакуль той жыў, пачалі масава прывозіць сваіх гарадскіх жонак з доўгімі кіпцюрамі і наклеенымі вейкамі, каб з заміланнем параўнаць іх светлае каханне з адносінамі экзатычных птушак, вопытны паляўнічы і рыбалоў зразумеў, што пакуль на возеры будуць плаваць гэтыя пародыі на гусей, пра рыбалку можна забыцца.

— Чаго вы лезеце да гэтага пачварства, — пачаў ён тлумачыць кожнаму, хто наведваўся на возера. — Гэта ж самае гадкае стварэнне на зямлі. І поскудзь якая, ой-ёй-ёй! Там, дзе жывуць лебедзі, не водзіцца аніякая птушка, бо гэтая погань яйкі іншых разбівае. Во ж дзе брыда.

— Але ж яны вельмі прыгожыя, — казалі людзі, не звяртаючы ўвагі на аргументы заядлага рыбака пра неэстэтычны выгляд доўгіх шыяў пражэрлівай азёрнай парачкі.

Дзеці таксама не збіраліся здаваць свае пазіцыі, і, спаборнічаючы адзін з другім у каго лебедзі больш возьмуць ежы з рук, працягвалі разганяць рыбу, нервуючы і ўводзячы ў шал старога Гур'яна. А тут яшчэ кіраўніцтва сельсавета, каб лебедзяў не напалохаць, вырашыла забараніць на гэтым возеры паляванне, нават як прыйдзе сезон. Маўляў, птушка рэдкая, чалавекам амаль вынішчаная, неабходна спрыяць аднаўленню папуляцыі.

Генадзь зразумеў, што яго манаполія на водныя рэсурсы сваёй мясцовасці скончылася. Зрасходаваўшы ўсе мірныя спробы разабрацца з тлустымі бочкамі сямейства птушыных, ён вырашыў дзейнічаць больш рашуча і радыкальна.

Як сцямнела, Гур'ян ціхенька зняў са сцяны стрэльбу і шмыгануў у бок вадаёма. Чакаць прыйшлося нядоўга. І як толькі з цемры выплылі дзве белыя мішэні, два кароткія стрэлы разрэзалі паветра ціхай вясковай ночы. І ніхто нічога не даведаўся б, каб не прыроднае захапленне Генадзя статыстыкай. Ужо хацеў збегчы дахаты, схаваць стрэльбу і прыкінуцца, што спіць, як сталі лезці ў галаву навязлівыя думкі кшталту: „А ці атрымаецца з двух лебедзяў адна падушка?" Вылавіў ён птушак з вады і хацеў уцякаць, а тут участковы міліцыянт, які прыляцеў на стрэлы праверыць хто закон парушае. Не сезон жа яшчэ на паляванне.

— Ты што, — кажа, — лебедзяў пастраляў?! Ах ты гад! Такое хараство знішчыў! А ці ведаеш ты, што яны ў Чырвоную кнігу Беларусі занесены?! Іх забіваць нельга. За гэта судзіць будуць. Лепш бы ты жонку застрэліў, то менш далі б.

А тут на крык і старшыня сельсавета прынёсся, і ляснічы з інспектарам аховы прыроды, і яшчэ паўвёскі ў прыдачу. Крычаць, лямантуюць, нібы канец свету надышоў. Пагражаюць Генадзю жудаснымі карамі, горшымі чым Страшны суд, ад чаго той ледзьве не памёр на тым месцы, на якім стаяў. І жонка яго, Гур'яніха, прыляцела з ліхтарыкам. Пасвяціла і давай плакаць воўчым выем:

— А што ж ты, звяруган, робіш! Нашто нашых гусей пабіў?!

І тут толькі ўсе, і Генадзь таксама, убачылі, што ён трымае ў руках за шыі звычайных гусей. Прычым сваіх. Гур'ян імгненна апамятаўся, зарыентаваўся ў сітуацыі, рэзка, плячом, адпіхнуў аслупянелага як зімовы сноп участковага, плюнуў у бок мясцовага начальства і пачаў помсціць за свой нядаўні перапалох:

— Ах, вы, брыдоты! Як вы маглі падумаць, што я такую прыгажосць пастраляю. А за гэты канцэрт, што вы тут учынілі, і перад людзьмі мяне знеслаўлялі, я вас па судах зацягаю. А гусей сваіх, калі хачу, тады і страляю. Маю на гэта права. Я можа так у страляніне практыкуюся. Паляўнічы сезон на дзікіх качак хутка абвесцяць. Вось я і трэніруюся, каб не прамазаць па качках і выпадкова лебедзя не параніць.

Ад такога нахабства ва ўчасковага сківіца адвісла ніжэй пупа. Ведае, што лжэ яму Гур'ян, а нічога зрабіць не можа. І астатнія начальнікі напалохаліся перспектывы знеславіцца перад усім раёнам у судах. Толькі гэтага ім не хапала. А што скажа раённае начальства. Чаго добрага яшчэ і з партыі папруць. Давай яны супакойваць паляўнічага на ўласных гусей, а той разышоўся, як сучка на каня. Ніяк не хоча дараваць.

І толькі недзе апоўначы супакоіўся, як усе па хатах разышліся. А праз тыдзень вёска, уключаючы і мясцовае начальства, і ўчасковага міліцыянта, і ляснічага з інспектарам аховы прыроды, зноў пачула ўночы два кароткія рэзкія стрэлы. Але ніхто не пайшоў цікавіцца, што там. А на другі дзень усе ўбачылі, што прапалі лебедзі. Як ветрам здула. Але абвінавачваць кагосьці ў іх знікненні ніхто не адважваўся. А праз нейкі час і ўвогуле пра гэтых птушак забыліся. Толькі недзе праз год Генадзь Гур'ян неяк пакаваў невядома скуль набытыя веды пра экзатычны від птушак, сказаўшы за куфлем піва, што каб зрабіць падушку двух лебедзяў хіба што мала. Трэба, напэўна, яшчэ пух двух гусей дабавіць.

Віктар САЗОНАЎ

03.12 – 09.12

Баран (21.03. — 19.04.) Шукаючы ідэальнага кахання, знойдзеш яго далёка ад свайго месца пражывання. Не будзеш скнарыць, наракаць на грошы, а неўзабаве будзеш раздаваць падарункі. Знакамітая форма. Дынаміка. Энергія. Рамантычныя прыгоды.

Бык (20.04. — 20.05.) Цікавыя знаёмствы. Пашанцуе ў фінансах. Не азірайся за прынцам, бо можаш трапіць як куляй у плот. Усё ж, добры час на любоўныя сустрэчы. Паафармляй усе справы ды квіты, асабліва з банкамі!

Блізняты (21.05. — 21.06.) Ненайлепшы настрой, не рабі нічога праз сілу. Убачыш шмат што ў новым святле, захочацца змен, да якіх ужо намерваешся ад года. У асабістым жыцці так многа падзей, што будзеш мець уражанне недахопу кантролю над уласным жыццём.

Рак (22.06. — 22.07.) Будзеш сарганізаваны, засяроджаны, здольны да вялікага высілку. 5.12. прыйдзецца пазмагацца з праблемамі, якія найчасцей адсоўваеш; будзь спакойны — няма чаго апасацца.

Леў (23.07. — 22.08.) Шмат крайніх эмоцый, ды будзь спакойны нават у справах, якія іншых давялі б да шалу. За акном слота і зяба, а ў тваім сэрцы — май!

Дзева (23.08. — 22.09.) Перамажы сваю натуральную нясмеласць і ясна скажы каханаму, у чым справа, чаго ад яго хочаш. Пазбягай спрэчак з людзьмі, якія распальваюць канфлікты. Крыху кампанейскіх сюрпрызаў; можаш стаць сведкам скандалу. На працы будзеш ведаць, на чым стаіш.

Шалі (23.09. — 22.10.) Твае помыслы, далікатнасць і краса будуць уражваць; вельмі добры час пашукаць і працу. На сапраўдных сяброў можаш разлічваць. Ахвота ўсё кінуць-рынуць; змены прывітаеш з энтузіязмам. Магчымасць нямала падзарабіць.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Захочаш ад патнёра крыху шаленства. Прыбыткі на рахунку; 6-10.12. прыцягваеш грошы як магніт! Наладзіш добрыя кантракты. Ты цяпер майстар аўтапрэзентацыі! Нікому на адпусціш! Ды шэф можа бурчаць. 5.12. старайся не быць адзін.

Стралец (22.11. — 21.12.) Магчымы канфлікт з бацькам, мужам ці братам. Аслабленне і паніжэнне энергіі неўзабаве міне. 5.12. жанатых і замужніх Стральцоў можа чакаць дробнае расчараванне. Не бойся новых выклікаў, шчасце цябе не пакіне.

Казярог (22.12. — 19.01.) Венера нясе табе каханне. Нос да інтарэсаў — добра заінвестуеш, падпішаш карысныя дамовы. Хоць да 6.12. ты нейкі негаваркі; твая назадаволенасць усім іншым можа папсаваць настрой.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Твой дом — аазіс адпачынку, бо на працы столькі заняткаў, што ледзь будзеш паспяваць. Затое шэф пахваліць і ўзнагародзіць. З 8.12. можаш загуляць. 5-9.12. зведаеш, што найкаштоўнае ў тваёй пары.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Неверагодная энергія, таксама і сексуальная, з якой можа і не будзеш ведаць, што рабіць. Затое справішся ў змаганні за павышэнне; хоць да 5.12. лепш сыходзь шэфу з дарогі! 5.12. нервовая атмасфера дома; не рэагуй занадта эмацыянальна.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка

1. напр. грып, 2. любіцель, 3. сіцылійскі вулкан, 4. трэці склон, 5. сузор'е, у каторым Сонца вітае Новы год, 6. блакітная вадкасць у арыстакратаў, 7. таварыш Дзяржынскага і Ягоды, 8. першы пасажыр карабля „Восток".

(Ш)

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Рамона Гомеса дэ ла Серны.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.



Адказ на адгаданку з 43 нумара

Дзераза, памяць, вулкан, сюіта, Кіеў, Сёмуха, зубраня, куля, юрта, мякаць, паліца, грыб, зяць, барсук.

Рашэнне: **За вуснамі, якія цалуюць, ёсць зубы, якія кусаюць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

ISSN 0546-1960